Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 СТУДЗЕНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 20 (30154)

МОДНАЕ ШОУ НА СЦЭНЕ 8

ГЕРОЙ ГІСТАРЫЧНАЙ СЯДЗІБЫ 12

КАРОТКА

- **Новы кіраўнік Міністэрства аховы здароўя ўдзеліць асаблівую ўвагу цэнам на лекі і медпаслугі.**
- Першыя расійска-беларускія самалёты плануецца выпусціць да 2026 года.
- **Партал Беларускай натарыяльнай палаты для здзяйснення натарыяльных дзеянняў адлалена пачне працаваць летам.**
- У Мінску адзначаецца сезонны ўздым захваральнасці на ВРІ.
- **Дзень адкрытых дзвярэй пройдзе ў Магілёўскім інстытуце МУС 17 лютага.**
- Беларусь і Кітайская асацыяцыя медыцынскага абсталявання дамовіліся аб узаемадзеянні.
- **У мінулым годзе ляскасы Беларусі нарасцілі экспарт піламатэрыялаў амаль на 40 працэнтаў.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Станіслаў ЮРЭЦКІ, старшыня Савета маладых вучоных НАН Беларусі:

«Моладзь актыўна ўключана ва ўсе прыярытэтныя напрамкі развіцця навуковых даследаванняў. Практычна кожны трэці даследчык у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — малады вучоны. Гэта сведчыць аб тым, што кадравы склад пастаянна абнаўляецца. Штогод у Нацыянальную акадэмію навук на работу і вучобу прыходзяць 300—350 маладых людзей, якія ідуць у магістратуру, аспірантуру і на пасады малодшых навуковых супрацоўнікаў, пачынаючы свой шлях у вялікай навуцы».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы мабілізаваліся і зрабілі нямала»

Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін прынялі ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы

На пачатку мерапрыемства, якое прайшло ў Канстанцінаўскім палацы Санкт-Пецярбурга, кіраўнік беларускай дзяржавы расказаў аб сур'ёзнай сумеснай рабоце, праведзенай з расійскім калегам за апошнія дні. «Мы сапраўды вельмі сур'ёзна папрацавалі гэтыя два дні, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Можна шчыра сказаць: ад Паўднёвага полюса да Паўночнага. Абмеркавалі праблемы і Антарктыды — ствараюцца там больш камфортныя ўмовы для працы расіян, зімовачны комплекс створаны. Але самае важнае, што там ніхто нічога не дзеліць. Беларусы працуюць разам з расіянамі. Наша станцыя побач. І ўсялякая дапамога — і навуковая, і ў побыце — аказваецца беларускім спецыялістам, якія там размешчаны».

Фота БелТА.

«Цэлы комплекс пытанняў — з Поўдня на Поўнач»

Прэзідэнт Беларусі працягнуў: «Далей мы з Уладзімірам Уладзіміравічам з поўдня ішлі на поўнач. Падвергнулі аналізу тыя падзеі, якія адбываюцца ў свеце. Вазьміце наша імкненне — Расіі і Беларусі, Кітайскай Народнай Рэспублікі... У авангардзе гэтага ідзе Расія, таму што яна больш за ўсё нагрузку нясе. І пакутуе больш, чым хтонебудзь».

Беларускі лідар падкрэсліў, што наступленне шматпалярнага свету і нежаданне цяперашняга манапаліста здаваць пазіцыі прыводзіць да канфліктаў у розных пунктах на карце свету. «І хусіты, і Блізкі Усход, і Паўднёва-Кітайскае мора, праблемы з Тайванем — гэта ўсё ад таго, што будзе шматпалярны свет, — патлумачыў ён. — Як казаў міністр замежных спраў Расіі, гэтага не хочацца манапалісту. Вось рознымі метадамі і спрабуюць утрымаць аднапалярны свет. Дайшлі да ўзброеных канфліктаў».

СТАР. 2

Абараніць асабістае

ЛІЧБАВЫЯ ПАРТРЭТЫ: МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЦІ ДЛЯ МАНІПУЛЯЦЫЙ?

У вайне за персанальныя даныя ўдзельнічаюць абаронцы, кіберзлачынцы і штучны інтэлект

Ущечку ў сецівa 26 мільярдаў запісаў вагой 12 тэрабайт, якая адбылася на днях, спецыялісты назвалі «маці ўсіх уцечак» — такой буйной страты даных яшчэ не здаралася, а тэндэнцыя крадзяжоў асабістых звестак грамадзян будзе толькі ўзрастаць, лічаць эксперты. Злачынцы працягваюць апераджаць сістэмы абароны аператараў, якія апрацоўваюць персанальныя даныя людзей і авалодваюць інфармацыяй. А «дапамагаюць» ім у гэтым магчымасці штучнага інтэлекту, які, на думку спецыялістаў, карыстаючыся «лічбавымі слядамі», што людзі самі пакідаюць пра сябе ў інтэрнэце, можа быць здольны абысці ўжо нават біяметрычныя параметры абароны, фактычна ствараючы лічбавага двайніка асобы. Актуальныя пытанні абароны персанальных даных (ПД), у прыватнасці праект Указа, які прапануе ўмацаваць лакалізацыю, то-бок вызначыць патрабаванні да апрацоўкі ПД асабліва ўразлівай інфармацыі на тэрыторыі Беларусі, больш за сотню экспертаў абмяркоўвалі на тэматычнай канферэнцыі ў сталіцы. Гаворка пра інфармацыю, якая складае таямніцу, што ахоўваецца законам: банкаўскую, урачэбную, натарыяльную, тэлефонных і іншых паведамленняў, аб апрацоўцы біяметрычных і генетычных ПД, апрацоўцы асабістых звестак непаўналетніх.

СТАР. 4

Знаёмімся з лаўрэатамі

КАБ ВОЧЫ ГАРЭЛІ І СПЯВАЛА ДУША

У Пінску працуе адзіны ў краіне майстар па вырабе балалаек і домраў

Крыху больш за два тыдні таму на сцэне Палаца Рэспублікі з рук Прэзідэнта краіны дыплом лаўрэата спецыяльнай прэміі дзеячам культуры і мастацтва ў ліку іншых атрымаў і адзіны ў краіне майстар па вырабе балалаек і домраў з Пінска Руслан МАКАРЭВІЧ. Узнагароды ён удастоены за плённую работу па адраджэнні традыцый стварэння музычных інструментаў.

Руслан МАКАРЭВІЧ.

ПА ВОЛІ ЛЁСУ

Будучы ўмелец з унікальным талентам нарадзіўся ў сям'і медыкаў. Як людзі інтэлігентныя, бацькі вырашылі, што дзеці павінны атрымаць музычную адукацыю. Так у хаце з'явілася піяніна, якое стаў асвойваць старэйшы брат, а за ім і Руслан. Хоць асаблівай стараннасці апошні і не выяўляў, але музычную школу наведваў спраўна. Там жа хлопчыка запісалі і ў аркестр рускіх народных інструментаў. «Будзеш іграць на балалайцы «Секунда», — пастанавіў кіраўнік. Адну з самых звонкіх відаў балалаек юны музыка асвоіў за месяц, а калі пачуў яе гучанне ў аркестры, душа літаральна затрымцела. Ён з задавальненнем імчаў на рэпетыцыю аркестра не толькі сярод тыдня, але і ў нядзелю раніцай.

СТАР. 9

«Мы мабілізаваліся і зрабілі нямала»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, на перагаворах з Уладзімірам Пуціным абмяркоўваліся і пытанні эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку з краінамі Азіі і Афрыкі: «Абмяркоўвалі мы і работу на азіяцкім кантыненце, асабліва ў Афрыцы, куды нас клічуць. Яны сапраўды нас там чакаюць. Найперш Расійскую Федэрацыю з вялізнымі магчымасцямі».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў работу па развіцці грузаперавозак па Паўночным марскім шляху. «Мы вельмі хацелі б, каб гэта праграма была хутчэй рэалізавана. Нам лягчэй было б працаваць», — падкрэсліў ён.

«Як бачыце, цэлы комплекс пытанняў — з поўдня на поўнач», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

«Дасягненне высокіх паказчыкаў — вынік выканання мерапрыемстваў 28 саюзных праграм»

Аляксандр Лукашэнка абазначыў галоўныя задачы і кірунку ў развіцці супрацоўніцтва ў Саюзнай дзяржаве як у бягучым перыядзе, так і на перспектыву.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што па выніках 2023 года бакі абновяць гістарычны максімум гандлю таварамі і паслугамі. «Уладзімір Уладзіміравіч за 10 месяцаў называў лічбу: больш за $40 млрд, але калі ўзяць у цэлым год (тавары і паслугі) — $54 млрд прыкладна будзе, — адзначыў Прэзідэнт. — Гэта сапраўды гістарычны максімум. Дасягненне высокіх паказчыкаў — шмат у чым вынік выканання мерапрыемстваў 28 саюзных праграм, у рамках якіх прынятыя прынцыповыя рашэнні. Але нам трэба яшчэ выпрацаваць агульныя крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці іх рэалізацыі».

Ключавымі на гэтым пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета з'яўляюцца даклады ўрадаў аб выкананні асноўных кірункаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады. У парадку дня і зацвярджэнне новага праграмнага дакумента на чарговы трохгадовы цыкл — на 2024—2026 гады. Ён прадугледжвае працяг работы па ўмацаванні адзінай эканамічнай прасторы і зняцці астатніх перашкод у гандлі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, важна ўзмацніць міжнароднае пазіцыянаванне саюза, як гэта робіцца ў ЕАЭС.

У якасці галоўнай задачы ў прамысловай сферы Прэзідэнт абазначыў актывізацыю супрацоўніцтва ў сферы імпартазамяшчэння. Пры гэтым ужо зроблена нямала. «Тут вельмі шмат зроблена, — падкрэсліў ён — Мы шмат зразумелі, што не разумелі яшчэ два гады таму. Нас не ўдалося паставіць на калені. Наадварот, мы мабілізаваліся і зрабілі нямала. Падпісаны базавыя міжурадавыя пагадненні аб прызнанні тэхналагічных аперацый, аб развіцці мікраэлектронных тэхналогій, праектаванні і вытворчасці электроннай кампанентнай базы, электроннага машынабудавання, аб адзінай прамысловай палітыцы. Учора мы з Уладзімірам Уладзіміравічам у сярэдзіне дня вельмі ўважліва прааналізавалі гэтыя пытанні на прыкладзе мікраэлектронікі».

Кіраўнік беларускай дзяржавы перакананы, што падрыхтаваны да падпісання дэкрэт на справе забяспечыць узаемнае прызнанне тэхналагічных аперацый. «Лічу, што ўрадам трэба ў найкарацейшыя тэрміны прыняць меры па яго безагаворачнай рэалізацыі, без якіх-небудзь адступленняў і выключэнняў», — дадаў ён.

Ад адзіных рынкаў газу і нафты да стварэння медыяхолдынга

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў аб неабходнасці ў што б там ні стала ўстараніць усё, што стрымлівае ўзаемныя пастаўкі тавараў, выраўняць умовы дзейнасці для прадпрыемстваў, ліквідаваць бар'еры ў сферы дзяржаўных закупак, зняць абмежаванні для транзіту тавараў. «Гэтыя тэмы не новыя, але пакуль яшчэ ў нас шурпатасцяў у гэтым плане хапае, — канстатаваў Прэзідэнт. — Асабліва адзначу, што мы пакуль цалкам не вызначыліся па самых галоўных пытаннях. Гэта датычыцца стварэння адзіных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў. Якраз той час, калі мы можам спакойна прымаць гэтыя рашэнні. Яны будуць выгадныя і для Расіі, і для Беларусі».

Паводле яго слоў, гэтыя прынцыпова важныя тэмы рэгулярна абмяркоўваюцца на перагаворах з Прэзідэнтам Расіі. «Дамоўленасці дасягнуты. Думаю, што ўрадам трэба больш актыўна рэалізоўваць гэтыя дамоўленасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Згадаў Прэзідэнт і аб лагістыцы перавозак беларускіх экспартных грузаў праз расійскія парты. У гэтым плане ёсць прапановы па павелічэнні прапускной здольнасці чыгункі ў напрамку партоў Санкт-Пецярбурга. «Мільёны тон беларускіх грузаў пераарыентаваны з партоў балтыйскіх дзяржаў на Санкт-Пецярбург, Мурманск, чарнаморскія парты, — падзяліўся дэталямі беларускі лідар. — Але напружанне існуе. Мы з Уладзімірам Уладзіміравічам месяцы тры таму абмяркоўвалі гэтую праблему. Прынялі рашэнне, што Кастрычніцкая чыгунка ў напрамку Піцера павінна больш інтэнсіўна працаваць. Там на першым этапе патрэбны і невялікія грошы, і невялікая праца, каб раз'езды аднавіць».

На пасяджэнні ВДС таксама абмяркоўваліся такія важныя тэмы, як урэгуляванне пытанняў агульнай уласнасці, зацвярджэнне стратэгіі навукова-тэхналагічнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2035 года, стварэнне саюзнага медыяхолдынга. «Упэўнены, усе разумеюць, наколькі важна праводзіць узгодненую інфармацыйную палітыку, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Ідзе магутнае інфармацыйнае супрацьстаянне. Многія называюць гэта вайной. Але, дзякуй богу, пакуль яшчэ нават у СМІ мы да вайны не падышлі. Але супрацьстаянне сур'ёзнае. Думаю, калі мы створым нармальны медыяхолдынг з улікам (існуючых. — «**Зв.**») спроб і памылак, будзе добры холдынг».

Новых свежых ідэй, а галоўнае, прарыўных эканамічных праектаў і канкрэтных прапаноў па развіцці супрацоўніцтва чакаюць ад XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які ў чэрвені пройдзе ў Віцебскай вобласці.

У бягучым годзе ў Саюзнай дзяржаве адзначаць шэраг знамянальных дат. Найперш 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 25-годдзе падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. «Гэта магутныя ідэалагічныя нагоды, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Мы не маем права імі не скарыстацца для прасоўвання нашых каштоўнасцяў і абароны праўды аб агульнай гісторыі».

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета праходзіць напярэдадні важных унутрыпалітычных падзей. Упершыню ў гісторыі Беларусі 25 лютага бягучага года адбудзецца адзіны дзень галасавання. «Па прыкладзе Расіі мы таксама ўстанавілі канстытуцыйна адзіны дзень галасавання, — удакладніў ён. — У гэты дзень будуць выбраны дэпутаты парламента, мясцовых Саветаў (у нас абласныя, раённыя і сельскія захаваны Саветы, як гэта было ў савецкія часы). І 17 сакавіка пройдуць прэзідэнцкія выбары ў Расіі. Перыяд такі няпросты, але, як вы бачыце, ён праходзіць спакойна. І я ўпэўнены: мы спакойна падыдзем да гэтых дат і таксама спакойна правядзём гэтыя мерапрыемствы».

На пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы зацверджаны Асноўныя напрамкі рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады. Дакумент накіраваны на далейшае фарміраванне нарматыўнай прававой базы для развіцця сумеснага эканамічнага патэнцыялу і галіновага ўзаемадзеяння ў розных сферах; развіццё канкрэтных праектаў у сферах прамысловасці, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, транспарту, адукацыі, статыстыкі, спорту і турызму, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, у інфармацыйнай прасторы.

Таксама прынята рашэнне аб стварэнні медыякампаніі Саюзнай дзяржавы. Плануецца, што ў структуру медыякампаніі ўвойдуць тэлеканал, друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і рэсурсны медыяцэнтр па стварэнні, адаптацыі і распаўсюджванні кантэнту ў лічбавым асяроддзі. Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы пры гэтым будзе ліквідавана.

На пасяджэнні ВДС зацверджана Стратэгія навукова-тэхналагічнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2035 года. Зацверджаны план мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама прысуджаны прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта. Фота БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Буркіна-Фасо, Малі і Нігер абвясцілі аб неадкладным выхадзе з ECOWAS

У сумесным камюніке трох дзяржаў, якое апублікавана на сайце канцылярыі прэзідэнта Нігера, гаворыцца, што іх кіраўнікі — капітан Ібрагім Траарэ (Буркіна-Фасо), палкоўнік Асімі Гаіта і брыгадны генерал Абдурахман Тчыяні (Нігер) — прымаюць суверэннае рашэнне неадкладна выйсці з рэгіянальнай заходнеафрыканскай арганізацыі. Як адзначаецца ў дакументе, пасля 49 гадоў існавання ECOWAS народы Буркіна-Фасо, Малі і Нігера са шкадаваннем, горыччу і расчараваннем канстатуюць, што арганізацыя адышла ад ідэалаў, на якіх яе стварылі заснавальнікі ў 1975 годзе: братэрства, салідарнасці, узаемадапамогі, міру і развіцця. «Акрамя гэтага, ECOWAS пад уплывам замежных дзяржаў, здрадзіўшы сваім асноўным прынцыпам, стала пагрозай для ўласных дзяржаў-членаў і насельніцтва, дабрабыт якога яна заклікана забяспечваць», — гаворыцца ў заяве. Ваеннае кіраўніцтва трох краін абвінаваціла ECOWAS у тым, што супольнасць не толькі не дапамагла ім у барацьбе супраць тэрарызму, але, калі гэтыя краіны вырашылі ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі, увяло супраць іх незаконныя, несправядлівыя і безадказныя санкцыі.

Брытанскія рэстараны масава закрываюцца з-за росту камунальных рахункаў

Тысячы рэстаранаў і бараў закрываюцца ў Вялікабрытаніі з-за росту камунальных рахункаў і кошту арэнды, паведаміла газета Independent са спасылкай на даныя кансалтынгавай групы CGA. «У індустрыі гасціннасці адзначаюць, што не спраўляюцца з-за грузу рахункаў за энергію, якія хутка растуць. Тысячы бараў, рэстаранаў і пабаў па ўсёй Вялікабрытаніі назаўжды спыняюць дзейнасць з-за празмернага кошту арэнды, вытворчых выдаткаў», — піша Independent. Адзначаецца, што са студзеня па верасень мінулага года ў Вялікабрытаніі закрывалі больш за дзесяць падобных устаноў за дзень. Пры гэтым іх агульная колькасць у краіне знізілася да менш чым 100 тысяч упершыню за ўсю гісторыю назіранняў. Сярод іншых фактараў, якія прыводзяць да закрыцця рэстаранаў і бараў у Вялікабрытаніі, таксама называюць рост цэн на прадукты і недахоп персаналу.

САА3 заклікае еўрапейцаў вакцынаваць дзяцей ад адру

У Еўрапейскім рэгіёне назіраецца трывожны рост захворвання на адзёр. Аб гэтым заявіла Сусветная арганізацыя аховы здароўя. У перыяд са студзеня да кастрычніка 2023 года ў 40 з 53 краін рэгіёна было зарэгістравана больш за 30 тысяч выпадкаў адру. Гэта ў трыццаць разоў больш, чым за ўвесь 2022 год, адзначыў Euronews. Паведамляецца аб амаль 21 тысячы шпіталізацый і пяці выпадках смерці, звязаных з адром. Эксперты чакаюць, што хваробу будуць яшчэ больш еўрапейцаў, калі не прыняць тэрміновыя меры для прадухілення распаўсюджвання захворвання. Эксперты САА3 заклікаюць еўрапейцаў вакцынаваць дзяцей ад гэтай хваробы.

«АГУЛЬНУЮ СПРАВУ РОБІМ»

Рабочы візіт Прэзідэнта Беларусі ў Санкт-Пецярбург пачаўся ў суботу, і яго праграма была надзвычай насычаная

Памятаць, каб захаваць нашу цывілізацыю

Мінулыя выхадныя ў Паўночнай сталіцы Расіі праходзілі пад знакам 80-гадовага юбілею поўнага вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады. Галоўныя ўрачыстыя мерапрыемствы праходзілі з удзелам Прэзідэнтаў Беларусі і Расіі.

Падчас цырымоніі адкрыцця Мемарыяльнага комплексу ў памяць аб мірных жыхарах СССР — ахвярах нацысцкага генацыду ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што нават праз 80 гадоў памяць аб тых падзеях прымушае сціскацца сэрцы, зноў адчуваць горыч страт, і радасць вызвалення, і неверагодны напал барацьбы за жыццё, за нашу Перамогу. «Цана Вялікай Перамогі — наш агульны боль. Агульны для ўсіх народаў, прыгавораных гітлераўскай Германіяй да смерці. Беларусы адчуваюць яго, як ніхто іншы», — сказаў ён. Па словах беларускага лідара, кожны з такіх помнікаў — «неабвержны доказ генацыду савецкага народа. Гэта прыгавор на стагоддзі, як бы камусьці гэтага не хацелася сёння».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што памяць аб ахвярах той вайны, аб гераізме нашых бацькоў і дзядоў сёння многім перашкаджае жыць, і перш за ўсё — ідэйным памагатым забойцаў і здраднікаў: «Гэта яны сёння ўшаноўваюць катаў у сваіх парламентах. Гэта яны пачалі вайну з магіламі і помнікамі ў Польшчы, Прыбалтыцы і Украіне. Поўныя вар'яты! Як можна думаць, што, разбурыўшы манумент, вы знішчыце памяць, якая жыве ў сэрцы народа? Народа, які знайшоў у сабе сілы выбудоўваць новыя мірныя адносіны з тымі дзяржавамі, якія яшчэ ўчора неслі пакуты і смерць на нашы землі».

Прэзідэнт падзякаваў Уладзіміру Пуціну, усяму расійскаму народу і тым, хто ствараў гэты манумент. «Дзякуй ад усяго шматпакутнага беларускага народа! Мы не можам змяніць мінулае, але нам пад сілу абараніць будучае. Няхай гэты мемарыял беражэ нашу агульную гістарычную памяць, братэрства народаў і сілу непарушнага адзінства нацый, якія з'ядналіся ў барацьбе з сусветным злом і перамаглі яго. Гэта вельмі важна для нас сёння. Міру, дабра і шчасця ўсім вам!» — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі ўсклалі кветкі да Вечнага агню, агледзелі мемарыяльны комплекс.

Мемарыял узведзены ў Гатчынскім раёне Ленінградскай вобласці, дзе ў гады акупацыі размяшчаліся шматлікія лагеры для ваеннапалонных, а таксама канцэнтрацыйныя лагеры для савецкіх дзяцей, якіх фашысты выкарыстоўвалі ў якасці донараў крыві для нямецкіх салдат. Тут загінула больш за 8 тысяч дзяцей.

Мемарыял будзе бачны ўсім, хто прылятае ў Санкт-Пецярбург, — побач знаходзіцца міжнародны аэрапорт Пулкава.

Тэму неабходнасці захавання гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне Прэзідэнт Беларусі прадоўжыў падчас канцэрта-рэквіема ў гонар 80-годдзя поўнага вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады. «Гэта праўда дэманструе глыбіню духоўнага і маральнага падзення тых, хто стаў пад сцягі нацысцкай Германіі. Яна падае чорным ценем на многія заходнееўрапейскія краіны. Гэта наша праўда. Але размова не ідзе аб варожасці з іх народамі. Мы, нашчадкі пераможцаў, процістаім ідэалогіі нацызму, ад якой пакутавалі і немцы, і французы, і многія-многія іншыя народы. Таксама мы ставім пытанне прызнання генацыду савецкага народа», — адзначыў беларускі лідар.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што да гэтага часу невядома дакладная колькасць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. І ў Беларусі, і ў Расіі ўсё яшчэ знаходзяць астанкі забітых маці, якія прыціскаюць да грудзей немаўлят. Грудных немаўлят, пахаваных жывымі. «Такіх сюжэтаў не злічыць. І лічбы выклікаюць жах», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы мірныя людзі. Мы не хочам вайны. Але перад намі зноў пастаўлена пытанне аб праве на жыццё нашай цывілізацыі, на захаванне спрадвечных каштоўнасцяў, нацыянальных культур. Чужога нам не трэба, асабліва тых даброт, якія не раз насаджаліся нашым продкам агнём і мячом. І тым не менш. Як пасля Перамогі, так і сёння мы заклікаем да мірнага дыялогу. Але пры ўмове паважання нашай гістарычнай памяці і праўды аб той вайне. Мы адкрыты любым дружалюбным крокам насустрач — і ў Расіі, і ў Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар расказаў, што, пад'язджаючы разам з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным да месца правядзення канцэрта, абмяркоўваў з ім, як сёння ацэньваюцца вынікі Вялікай Айчыннай вайны. «І ён назваў адну жудасную ідэю нашых агідных, якія да гэтага часу не могуць супакоіцца. Нашых агідных — маладых, якія не бачылі вайны, ды і сур'ёзнага гора не бачылі. Якія гавораць: «Ды не трэба было абараняць Ленінград. Трэба было яго пакінуць — і вялізную колькасць, больш за мільён, жыццяў бы захавалі». Небяспечная тэндэнцыя. Яны, сволачы, з мінулага спрабуюць глядзець у сучасны дзень», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле гэтай логікі, заўважыў ён, калі не трэба было абараняць Ленінград, то не варта было абараняць і Маскву, ды і наогул не трэба было абараняцца.

«Я згодны з Прэзідэнтам Расіі, які гаворыць: «Мы страцілі б сваю цывілізацыю і сёння не жылі б тут, калі б не змагаліся за кожны кавалак зямлі». Але, як я сказаў, яны з мінулага глядзяць у сучаснае. І логіка ў чым: ды не трэба супраціўляцца, не трэба змагацца. Яны сёння на нашых граніцах тоцяць мячы, каб прыйсці да нас. Яны едуць ізноў да нас, каб зрабіць нас «лепшымі». І дзе будзем мы? Вось галоўнае пытанне, на якое мы сёння спрабуем адказаць. Мы адказваем і адкажам, будзьце ў гэтым упэўнены. І няхай памяць аб тых, хто пайшоў ад нас, натхняе нас на стварэнне ў імя будучыні нашых народаў, у імя міру. Мы захаваем сваю цывілізацыю, у гэтым вы можаце быць упэўнены», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Лукашэнка.

Ад антарктычных даследаванняў да спартыўных дасягненняў

Сімвалічна, што ў нядзелю, у Дзень беларускай навукі, Аляксандр Лукашэнка разам з расійскім калегам прыняў удзел у мерапрыемстве, якое непасрэдна датычыцца і нашых вучоных, — ва ўводзе ў доследную эксплуатацыю новага зімовачнага комплексу на станцыі «Усход» у Антарктыдзе ў рэжыме відэаканферэнцыі.

Ён канстатаваў, што да цяперашняга часу гэта самы малавывучаны мацярык планеты. «Расія з'яўляецца лідарам у вывучэнні Антарктыкі на сёння. Ніхто не можа з гэтым параўнацца. У нас была вялікая краіна — Савецкі Саюз. Мы разам працавалі. Але калі нехта спадзяваўся, што гэта ўсё загіне, — аказваецца, не загінула, а выйшла на больш высокі ўзровень», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён таксама падзякаваў расійскім сябрам, якія і раней, і цяпер дапамагаюць беларускім вучоным з размяшчэннем на сваёй станцыі, падтрымліваюць даследаванні, дзеляцца навуковымі данымі, даюць абсталяванне. «Ведаю, што працуе і наша абсталяванне там (у Антарктыдзе. — **«Зв.»**). Мне далі інфармацыю: у 2018—2020 гадах тут быў уведзены ў эксплуатацыю ўльтрафіялетавы фатометр канструкцыі беларускага ўніверсітэта. Я ўпэўнены: праграма будзе прадаўжацца з выкарыстаннем гэтага абсталявання. Я ў Беларусі звярну больш пільную ўвагу на развіццё гэтага сектара навукі і практыкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь на працягу шэрагу гадоў рэалізоўвае і сваю антарктычную праграму. Пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы ў 2006 годзе краіна пачала свой шлях у асваенні Антарктыды. У НАН Беларусі 30 кастрычніка 2023 года быў дадзены ўрачысты старт 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі на чале з вопытным палярнікам, удзельнікам усіх папярэдніх 15 экспедыцый Аляксеем Гайдашовым. У першай дэкадзе студзеня бягучага года была праведзена паветраная грузавая аперацыя па дастаўцы генеральнага грузу і супрацоўнікаў Беларускай антарктычнай экспедыцыі на палявую базу «Гара Вячэрняя». Яна размешчана на ўзбярэжжы мора Касманаўтаў недалёка ад сезоннай расійскай станцыі «Маладзёжная».

Наступнае месца наведвання двух лідараў — «СКА Арэна» — нядаўна ўзведзены ў Санкт-Пецярбургу найбуйнейшы хакейны стадыён у свеце. Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін агледзелі розныя памяшканні «СКА Арэны», азнаёміліся з умовамі, створанымі як для гульцоў, так і для балельшчыкаў, цёпла пагутарылі з гульцамі каманды СКА, панаціралі за трэніроўкай на лёдзе. Лідарам краін на памяць падарылі хакейныя джэрсі з сімволікай каманды.

Заўсёды ёсць пра што пагаварыць

У нядзелю Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі перагаворы ў Канстанцінаўскім палацы ў Санкт-Пецярбургу. Кіраўнікі дзяржаў сур'ёзна акунуліся ў эканоміку і пытанні ваенна-прамысловых комплексаў. Таксама закранулі парадак дня Вышэйшага дзяржсавета, што меўся адбыцца назаўтра.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў былыя часы, калі Беларусь і Расію «не так душылі», такія дні правядзення ВДС і двухбаковых перагавораў заўсёды былі напоўнены абмеркаваннем нейкіх пытанняў, якія трэба было б вырашыць на ўзроўні ўрадаў.

«Сёння яны вырашаюцца ўрадамі. Ну а «шліфануць» парадак дня — наша з вамі святая справа. Я вельмі рады і задаволены нашай сустрэчай. Заўсёды гатовы прыехаць у любое месца ў Расіі. Ёсць што паглядзець, ёсць пра што пагаварыць», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама згадаў аб сумесных мерапрыемствах, якія прайшлі ў нядзелю перад перагаворамі. «Што датычыцца Антарктыкі, правільна ў Савецкім Саюзе ніхто нічога не дзяліў, працавалі разам. І я вельмі рады. Як і вы, я думаю, у тым ліку. Мы рады, што мы не разышліся. Агульную справу робім. І я падумаў: ну якая краіна магла б даць такія магчымасці такой краіне, як Беларусь! Мы ж у Расіі, па вялікім рахунку, не бачым ніякіх праблем. У Расіі шмат чаго ёсць. — «Калі ласка, прыходзьце, працуйце, давайце разам, бярыце, зарабляйце, дзейнічайце». — Ні адна краіна не здольна была б так адносіцца, як вы адносіцеся да Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Зноў жа я праецырую: а што перашкаджала Украіне, балтыйскім краінам так працаваць з намі? Гэта наш свет, мы яго выбудоўвалі некалькі дзесяцігоддзяў, мы разам перамаглі ў гэтай страшнай вайне. Ну давайце рухацца ў гэтым напрамку! Не, не хочацца — шукаюць за морамі лепшага жыцця», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Згадаў ён і важныя для народаў абедзвюх краін мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-годдзя вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады. «Ну так, неяк мы з вамі адчулі, што нядрэнна было б, каб побач стаяў хтосьці з Украіны. Усё ж такі тры славянскія народы пацярпелі. Але гэта іх выбар. Што рабіць, у іх іншы курс... Але, думаю, што яны вернуцца да нас. Дзявацца няма куды», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

ЛІЧБАВЫЯ ПАРТРЭТЫ: МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЦІ ДЛЯ МАНІПУЛЯЦЫЙ?

ШТО ХВАЛЮЕ БЕЛАРУСА

«Зліў» асабістай інфармацыі ў Сеціва адбываецца бадай што ва ўсіх краінах свету. У Беларусі спецыялістамі Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных за два гады работы было выдалена больш як 22 мільёны даных беларусаў, якія незаконна апрацоўваліся, у тым ліку 2,3 мільёна ўнікальных запісаў. З гэтай лічбы каля 100 тысяч запісаў былі выдалены ў выніку скаргаў грамадзян, а амаль 2,2 мільёна — у выніку дзейнасці Цэнтра. Пры гэтым каля 600 тысяч з 2,2 мільёна яшчэ не паспелі трапіць у Сеціва, расказаў **Андрэй ГАЕЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных (НЦАПД)**.

— Усё гэта — сведчанне таго, што ў свеце ідзе вайна за ПД, якія сталі ўжо значнай сацыяльна-эканамічнай каштоўнасцю, і збіраць гэту інфармацыю дапамагаюць у тым ліку і тэхналогіі штучнага інтэлекту. Сёння дзейнасць многіх структур скіравана не толькі на канструктыў (рабіць жыццё чалавека больш зручным, дазваляць хутчэй вырашаць задачы і развіваць нацыянальную эканоміку), але і на злаўмысныя мэты (маніпуляцыі, кампраментацыі, шантажу, палітычнай агітацыі). «Лічбавыя партрэты» людзей, якія ствараюцца па слядах наведвання імі пэўных рэсурсаў, збіраюцца і дазваляюць рабіць уздзеянне на чалавека пунктавым.

У нашай краіне пытанням абароны персанальных даных удзяляецца пільная ўвага, гэта тэма замацавана канстытуцыйна і набывае гучанне ў іншых стратэгічных дакументах, накшталт Канцэпцыі прававой палітыкі, праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, Указа Прэзідэнта № 40 аб кібербяспецы, дадаў дырэктар Цэнтра:

— Умацавана работа па інфармаванні людзей аб іх правах, магчымасцях, гарантыях рэалізацыі правоў ў сферы абароны даных. Разуменне грамадзянамі значнасці асабістай інфармацыі, сацыяльнай каштоўнасці даных істотна павысілася. Людзі актыўна карыстаюцца сваімі правамі, яны сталі больш абачліва ставіцца да выкарыстання інфармацыі аб сабе і сваяках. Гэта пацвярджае і характар зваротаў у Цэнтр: летась было ўдвая больш скаргаў на парушэнні правоў, чым за 2022-і.

Людзей найбольш хвалююць кірункі, звязаныя з работай рытэйлаў, — яны скардзяцца на празмерны збор інфармацыі, на паступленне без іх згоды рэкламных паведамленняў і званкоў; скардзяцца таксама на дзеянні таварыстваў уласнікаў, у прыватнасці на збор біяметрычных даных для ўваходу ў пад'езды, на ўсталяванне камер відэаназірання на рабоце.

— Цяпер апрацоўваць ПД як раней у бізнесу не атрымаецца, бо людзі разумеюць свае правы і імкнуцца іх рэалізоўваць. Сёння сацыяльная адказнасць бізнесу не можа існаваць без паважлівага стаўлення да ПД чалавека.

Пытанне абароны ПД напрамую звязаны з развіццём лічбавізацыі ў розных галінах. Адпаведна, узрастае і аб'ём праблем, з якімі сутыкаецца Цэнтр, дадала **Ганна РАБАВА, намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі**:

— Мы ўсе як грамадзяне хочам зберагчы сваю персанальную прастору, аднак пры гэтым атрымліваць паслугі ў самым камфортным выглядзе. Ужо год як дзейнічае электронная сістэма па рабоце са зваротамі грамадзян, і палова запытаў ад іх паступае з пытаннямі, чаму так складана ўваходзіць у сістэму і чаму такая складаная сістэма ідэнтыфікацыі, а палова пераживае, каб ПД не ўцяклі. У гэтым мы ўсе: і хочам, і баімся — ці будзе атрыманых плюсаў больш, чым рызык. Часам тэлефон прапануе нам рэчы, пра якія мы толькі падумалі, і гэта пужае і здзіўляе. І чым больш мы даём пра сябе інфармацыі, тым больш даных, якія дазваляюць намацаць у нас кропкі фізічнай і эмацыйнай уразлівасці. Нядобрасумленныя карыстальнікі ПД апераджаюць нас па інтэнсіўнасці развіцця сродкаў для іх крадзяжу. І гэта традыцыйная гонка паміж тымі, хто прывык жыць па законе (яны больш статычныя), і тымі, хто яго парушае (яны ўвесь час у руху).

Спецыяліст нагадала і пра небяспеку гульняў са штучным розумам, калі людзі знаходзяцца ў стадыі радасцу немаўлят ад створанага рэсурсу. Яна дадала, што ў інфармацыйныя сістэмы, якія ствараюцца, закладваюцца тэхнічныя абмежавальнікі, і яны павінны быць дакладна ўвязаны з нарматыўнымі абмежавальнікамі.

Магчымасці штучнага інтэлекту (ШІ) трэба нарматыўна рэгуляваць, каб былі рамкі яго магчымасцяў, пагадзіўся з гэтым Андрэй Гаеў:

— Ужо былі спробы збору праз сістэму штучнага інтэлекту звестак для складання лічбавага партрэта чалавека. Магчымасці ШІ дазваляюць ужо нават без біяметрычных даных, якія ўцяклі ў сеціва, а проста на падставе збору звестак па фатаграфіях, голасе, пэўных аспектаў знаходжання чалавека ў Сеціве сабраць біяметрычныя звесткі і абысці сістэмы абароны. Ёсць і спробы выкарыстаць такую інфармацыю для атрымання крэдытаў і іншых фінансавых аперацый.

СКЛАДАЦЬ ПРАТАКОЛЫ, ПАВЫШАЦЬ ШТРАФЫ

Летась спецыялісты Цэнтра правялі больш за 200 кантрольных мерапрыемстваў. У 18 выпадках накіраваны матэрыялы для прыцягнення вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці. У некалькіх сотнях выпадкаў былі ўзбуджаны крымінальныя справы ў дачыненні да незаконнага збору і апрацоўкі ПД у Беларусі.

— Работа працягнецца і надалей, — запэўніў Андрэй Гаеў. — Найперш гаворка аб наданні дзейнасці Цэнтра комплекснага завершанага характару, каб яго спецыялісты мелі паўнамоцтвы складаць пратаколы на парушальнікаў, не звяртаючыся да органаў унутраных спраў. Неабходна таксама павышаць памеры штрафных санкцый, бо для юрыдычных асоб максімальны штраф за непрыняцце мер па абароне ПД цяпер 50 базавых велічынь. Гэта непараўнальна мала з памерамі затрат, якія неабходна панесці бізнесу, каб абараніць нашы з вамі правы. І многія такім чынам проста адкупаюцца мінімальнымі сумамі ад сваіх абавязкаў.

У Расіі літаральна год таму чарговы раз павысілі штрафы, і за апрацоўку ПД без згоды чалавека аператар мусіць заплаціць 1,5 мільёна расійскіх рублёў (звыш 53,6 тысячы беларускіх рублёў). А Дзярждумай у першым чытанні прыняты законапраект, згодна з якім інцыдэнты з базамі даных да 10 тысяч адзінак інфармацыі будуць карацца штрафамі да пяці мільёнаў расійскіх рублёў (больш як 184,2 тысячы беларускіх), а звыш 100 тысяч запісаў — штрафам у 15 мільёнаў (каля 553 тысяч беларускіх). Пры паўторным парушэнні патрабуецца вызначаць суму штрафу да 3 % ад выручкі за год да 500 мільёнаў рублёў. Беларусі таксама трэба працаваць у гэтым кірунку, упэўнены Андрэй Гаеў. Ён дадаў, што сёння яны сумесна з Мінінфармам працуюць над парадкам блакіроўкі доступу да інфармацыйных рэсурсаў у выпадку парушэння імі апрацоўкі ПД:

— Неабходна ў масіве інфармацыі, якая збіраецца, выключыць апрацоўку таго, што непатрэбна. Дакладна вызначыць патрэбы ў выкарыстанні асабістай інфармацыі і замацаваць гэта нарматыўна.

Ва ўзаемадзеянні з бізнесам спецыялісты Цэнтра бачаць нераскрыты патэнцыял у кірунку стварэння комплексных прадуктаў — тэхналагічных алгарытмаў, якія дазволяць апрацоўку ПД у канкрэтных інфармацыйных рэсурсах канкрэтных арганізацый. Магчыма, будуць выпрацаваны сектаральныя рэкамендацыі (кодэксы паводзін) бізнесу ў апрацоўцы ПД.

У рамках Указа Прэзідэнта № 40 аб кібербяспецы ў Беларусі павінны стварацца кіберцэнтры па супрацьдзеянні кіберпагрозам і рэагаванні на кібератакі. Падобныя кіберцэнтры ствараюцца, у прыватнасці, у банкаўскай сферы. Мяркуецца, што да красавіка 2025 года ўся банкаўская сістэма будзе мець свае кіберцэнтры або набываць паслугу па абароне ў рамках кіберцэнтра, заўважыла **Іна ЛЯГЧЫЛАВА, начальнік управлення абароны персанальных даных у фінансавай сферы**:

— Асаблівасць абароны банкаўскай сферы ў тым, што большасць банкаўскіх прадуктаў, якія прапануюцца, утрымліваюць ПД. Усе мы прывыклі, што інструменты, якія прапануюцца, вельмі зручныя, тэхнічныя і хуткія для людзей. Кібератакі ідуць непасрэдна на інфармацыйную сістэму. Таму неабходна сукупнае стварэнне прававога, тэхналагічнага поля і непасрэдна кантролю і маніторынгу. З 1 сакавіка ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта № 269 аб несанкцыянаваных плацежных аперацыях, дзе будзе распрацаваны механізм сукупнасці дзеянняў банкаў і праваахоўных органаў.

Ірына СІНІЦА, фота аўтара.

НОВЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ ЛІТАРАТУРНАЙ ДРУЖБЫ З КІТАЕМ

Цікавы мастацкі дыялог (ці хутчэй нават — «размова на траіх») прайшоў у Выдавецкім доме «Звязда», які прымаў у гасцях кітайскую перакладчыцу дзіцячай літаратуры Лі Цзянхуа, выкладчыка рускай мовы ў Акіяналагічным універсітэце ў Цындаа. Зараз літаратар праходзіць творчую стажыроўку ў Інстытуце сацыяльна-гуманітарнай адукацыі Маскоўскага педагагічнага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Разам з кітайскай даследчыцай, літаратарам удзел у размове прынялі кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры культуралогіі Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі Маскоўскага педагагічнага дзяржаўнага ўніверсітэта Людміла Максімава і дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска Таццяна Швед.

Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч пазнаёміў гасцей з кітайскім кірункам у медыйнай і кнігавыдавецкай дзейнасці «Звязды». Размова ішла пра кніжную серыю «Светлыя знакі: паэты Кітая», пра анталогію перакладаў кітайскай паэзіі «Пад крыламі дракона», праект, які ажыццявіў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі.

Лі Цзянхуа вядомая як перакладчыца больш як дзесяці кніг рускай дзіцячай літаратуры на кітайскую мову. У тым ліку — славутай «Лясной газеты» Віталія Бянкі, якую добра ведаюць і ў Расіі, і ў Беларусі, і на ўсёй постсавецкай прасторы. Кітайская перакладчыца зазначыла, што ёй цікавая і беларуская дзіцячая літаратура, пра якую пакуль што яна нічога не ведае, але спадзяецца адкрыць новыя для кітайскага чытача імёны. Алесь Карлюкевіч заўважыў, што добра вядомы кітайскі прапагандыст і перакладчык славянскіх літаратур Гаа Ман пераўвасобіў на кітайскую мову зборнік «Беларускія народныя казкі». Здзейснены ў Кітаі пераклад і выданне і «Палескіх рабінзонаў» класіка беларускай дзіцячай літаратуры Янкі Маўра.

Лі Цзянхуа, Таццяна Швед, Людміла Максімава ў «Звяздзе».

Сёння ў Кітаі працуе ўжо група перакладчыкаў сучаснай беларускай літаратуры, а таксама твораў класікаў беларускай паэзіі і прозы на кітайскую мову. Сярод іх — і прафесар Гу Юй, які пераўвасобіў на сваю родную мову вершы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Цёткі, Максіма Танка, Анатоля Сыса, Яўгеніі Янішчыц, Алеся Бадака і іншых паэтаў. Зараз рыхтуецца да выдання кніга яго перакладаў. Шмат дзеля прапаганды беларускай літаратуры ў Кітаі робіць доктар філалагічных навук Чжан Хуэйцінь, якая выступіла ініцыятарам выдання кнігі «Зборнік сучаснай беларускай літаратуры» на кітайскай мове. Выданне пабачыла свет у Пекіне напрыканцы 2022 года. Зараз перакладчыкам і літаратуразнаўцам Хань Сяе падрыхтавана да друку кніга прозы і паэзіі Алеся Бадака на кітайскай мове.

— Я ўражана тым, што ўжо робіцца на ніве беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння ў наш час, — зазначыла Лі Цзянхуа. — Абавязкова павязу з Беларусі ў Кітай новыя ідэі, новыя кнігі, мяркую, што мне ўдасца прычыніцца да перакладу беларускай дзіцячай літаратуры на кітайскую мову. Ведаю, што ў вас юныя чытачы вельмі шануюць і творчасць класікаў, якія працавалі ў літаратуры 50 і болей гадоў назад, — Уладзіміра Дубоўкі, Васіля Віткі, Алеся Якімовіча, Івана Сяркова, іншых паэтаў і празаікаў. Мне шмат расказалі пра беларускага класіка Уладзіміра Караткевіча, я даведалася, што ўжо перакладзена на кітайскую мову яго аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха». Хацелася б і мне стаць перакладчыкам яго сапраўды неўміручых твораў, паколькі іх вельмі часта перавыдаюць.

Алесь Карлюкевіч расказаў пра тое, што ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі распрацоўваецца праграма па прадстаўленні найлепшых набыткаў беларускай літаратуры ў свеце ў перакладзе на іншыя мовы. І выказаў спадзяванне, што і Людміла Максімава, і Лі Цзянхуа стануць сапраўднымі паўнамоцнымі прадстаўнікамі беларускай літаратуры ў сваіх краінах — у Расіі і Кітаі.

Раман СЭРВАЧ. Фота Кацярыны УРБАН.

Захоўваць і берагчы дзікую прыроду можна па-рознаму. Хтосьці мяркуе, што калі абмежаваць уплыў чалавека, уводзячы розныя забароны і пакаранні, то гэтага будзе цалкам дастаткова для самааднаўлення экасістэмы. Іншыя, лічачы, што антрапагенны фактар ужо дасягнуў такога ўзроўню, калі не ўлічваць яго немагчыма, выступаюць за актыўнае кіраванне біясферай, перабудоўваючы яе пад свае патрэбы. Хто мае рацыю? Хутчэй за ўсё, тыя, хто не кідаецца ў крайнасці і разумна сумяшчае розныя падыходы. Бо не варта забываць, што чалавек — такая ж частка прыроды, як і ўсё, што вакол нас, і мы цалкам залежым ад рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

ДЗЕ ЛАНІ ЎЖЫВАЮЦЦА З МУФЛОНАМІ

Для чаго патрэбна вальернае ўтрыманне дзікіх жывёл

Адной з эфектыўных актуальных практык падтрымкі біяразнастайнасці з'яўляецца вальерная гаспадарка. Скарачэнне натуральных месцаў пасялення дзікіх звяроў і птушак заканамерна адбіваецца на іх колькасці, змушае людзей шукаць варыянты прадухілення негатыўных наступстваў. А калі гаворка ідзе пра віды, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў гаспадарчай дзейнасці, то абысціся без вальераў бывае немагчыма. Напрыклад, у мэтах зніжэння паляўнічага прэса на вольнажывучыя папуляцыі, менавіта вальеры прымаюць на сябе частку нагрузкі падчас паляванняў. Ды і стварэнне спрыяльных умоў для ўзнаўлення жывёл, мінімізацыі рызык іх выпадковай гібелі, ажыццяўленне пастаяннага кантролю і аховы ва ўмовах абмежаванай тэрыторыі вядзецца больш рэзультатыўна.

Цяпер у Беларусі налічваецца некалькі дзясяткаў розных вальераў. Адзін з іх, які лічыцца флагманам у сістэме Мінлясгаса, размешчаны на тэрыторыі ДЛГУ «Астравецкі доследны лясгас». Як расказаў **вядучы інжынер па паляўнічай гаспадарцы лясгаса Віктар УРБАНОВІЧ**, рашэнне аб будаўніцтве вальера было прынята ў 2006 годзе ў рамках выканання мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы развіцця паляўнічай гаспадаркі на 2006—2015 гг. І ўжо ў 2007 годзе першыя 30 асобін аленя высакароднага, узятыя з белавежскай папуляцыі, уладкаваліся на астравецкай зямлі.

Вальер агульнай плошчай 220 га падзелены на некалькі адасобленых участкаў, дзе размяшчаюць розных жывёл. Нягледзячы на тое што ў натуральным асяроддзі многія звяры жывуць на адзінай тэрыторыі, ва ўмовах абмежаванай прасторы далёка не ўсім відам камфортна быць побач. Так, калі папулярна было развадзіць у няволі дзікоў, з-за іх звычкі вытоптваць і ўсё

перакопваць гінулі пашы, і алені проста заставаліся без належнага корму, таму дзікоў сялілі асобна. Пасля пэўных праблем ад вальернага ўтрымання дзікоў адмовіліся. І цяпер у вальеры разводзяць высакароднага аленя, еўрапейскую лань, аленя плямістага і муфлона еўрапейскага. Пры гэтым лань спакойна ўжываецца з муфлонамі, а вось высакародных аленяў і плямістых разам утрымліваць нельга, бо яны могуць скрыжоўвацца і даваць гібрыды.

З жывёл, якія ёсць у вальеры, звычайныя для Беларусі толькі алені высакародныя. Лань еўрапейская (часам яе называюць даніэль), як сцвярджаюць навукоўцы, у даўнюю пару насяляла нашу тэрыторыю, але потым знікла, верагодней за ўсё, была знішчана. Цяпер жа ёсць задумка вярнуць даніэль у нашы лясы і палі, як было некалькі стагоддзяў таму. У 2008 годзе ў астравецкі вальер з Літвы завезлі 60 ланяў. За мінулыя гады, паводле слоў Віктара Урбановіча, пагалоўе значна выраслa, і ўжо больш як 250 асобін адпраўліся ў іншыя гаспадаркі. У найбліжэйшай перспектыве — планы па выпуску ланяў і фарміраванні мясцовай вольнажывучай папуляцыі.

Алень плямісты і муфлон еўрапейскі — для Беларусі

віды нехарактэрныя. Аднак попыт на іх высокі. Яны цікавыя як паляўнічым, так і тым, хто ўтрымлівае вальеры ў дэманстрацыйных мэтах. Радзімай «пятнашкі» (алень плямісты, «алень-кветка») з'яўляецца паўднёва-ўсходняя частка Азіі. На Далёкім Усходзе колькасць дзікіх плямістых аленяў у 20-я гады мінулага стагоддзя складала ўсяго 900—1000 асобін, а да 1946 года яна зменшылася да 300. Катастрафічнае скарачэнне паслужыла прычынай уключэння гэтага віду ў 1974 годзе ў Чырвоную кнігу Міжнароднага Саюза аховы прыроды і Чырвоную кнігу СССР. Работы па акліматызацыі «аленя-кветкі» ў прыдатных прыродных умовах пачалі праводзіць яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Але прайшлі дзесяцігоддзі, перш чым удалося дасягнуць паспяховага выніку. Пэўную станоўчую ролю адыгралі ў гэтым працэсе саўгасы, якія спецыялізуюцца на атрыманні пантоў, і паляўнічыя гаспадаркі, якія паспяхова асвоілі развядзенне «пятнашак». У Беларусі плямісты алень з'явіўся дзякуючы Дзяржаўнай праграме па развіцці паляўнічай гаспадаркі ў мэтах узбагачэння відавой разнастайнасці паляўнічых капытных жывёл. У Астравецкім лясгасе «алень-кветка» з'явіўся ў 2007 годзе.

Першыя 30 асобін муфлонаў былі завезены з-за мяжы ў Астравецкі лясгас у 2014 годзе. Нягледзячы на тое што іх гістарычнай радзімай з'яўляюцца астравы Міжземнамор'я — скалістыя горныя прасторы, яны добра адаптуюцца да новых умоў і ўжо даўно інтрадуцыраваны ва ўгоддзі многіх еўрапейскіх краін. Не стала выключэннем і наша. У вальеры бараны паспяхова размнажаюцца, і іх групоўка стабільна павялічваецца. Дарэчы, муфлоны, якія ў снежні мінулага года папоўнілі краявідны склад сафары-парку Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», родам з астравецкага лясгаса.

А вось роля вальераў у лёсе аленяў высакародных некалькі іншая. Спачатку колькасць вольнажывучых груповак аленяў была нязначнай. Напрыклад, у 2008 годзе ў паляўнічых угоддзях мясцовага лясгаса налічвалася ўсяго 24 асобіны аленя высакароднага. За першыя пяць гадоў работы вальера на волю было выпушчана 50 галоў. І ўжо да 2013 года, па даных улікаў, ва ўгоддзях жыло 100 аленяў. Акрамя гэтага, шэсць галоў перадалі ў іншы лясгас, і ў вальеры засталася група для далейшага ўзнаўлення і рассялення. Рэгулярны выпуск аленяў стаў звычайнай з'явай. Зрэшты, як адзначыў у гутарцы Віктар Урбановіч, адным толькі павелічэннем колькасці мясцовай папуляцыі справа не абмяжоўваецца. Наяўнасць вальера і значнага пагалоўя дае магчымасць весці селекцыйную работу, накіраваную на паляпшэнне трафейных якасцяў звяроў. Мэтанакіраваны абмен аленямі з гаспадаркамі з іншых рэгіёнаў прыўносіць свежую кроў мясцовай групоўцы. Прапрацаваўшы ўжо больш за шаснаццаць гадоў у паляўнічай гаспадарцы, Віктар Мечыслававіч адзначае, як змяніліся за гэты час алені ва ўгоддзях: яны сталі буйнейшымі, больш гарманічнай стала іх канстытуцыя, рогі многіх самцоў вартыя кнігі трафеяў. Работы па абнаўленні і паляпшэнні папуляцыі мясцовых аленяў вядуцца пастаянна, і без вальера тут не абысціся.

Пэўную цікавасць уяўляе вальерная гаспадарка ў справе экаасветы. Магчымасць зблізку ўбачыць лясныя прыгажуноў, ацаніць краявідныя адрозненні, даведацца асаблівасці паводзін, кармлення, пачуць ад спецыялістаў займальны аповед аб мясцовых насельніках — усё гэта можна атрымаць на спецыяльных экскурсіях, якія праводзяцца ў Астравецкім лясгасе і на экасцежцы, куды ўваходзіць наведванне вальернага комплексу. Падчас школьных канікул частыя госці вальера — дзеці з найбліжэйшых школ.

Што ж датычыцца паляванння, то ў Беларусі на сёння склалася сітуацыя, калі ўгоддзі поўныя самай разнастайнай дзічыны: хочаш трафейнай якасці — калі ласка, хочаш на мяса — няма праблем. Так, кантроль жорсткі, браканьерам спуску няма, але затое і звера шмат. У вальерах таксама палююць. Аднак гэта не такое ўжо масавае захапленне, усё-ткі большасць паляўнічых аддае перавагу паляванню на вольнага звера. Але вось разумець, якую сёння ролю адыгрываюць паляўнічыя вальеры ў захаванні біяразнастайнасці, павелічэнні колькасці дзікіх жывёл, іх рассяленні, — неабходна, таму што менавіта рацыянальнае і беражлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў у выніку вызначае якасны ўзровень нашага жыцця.

Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского»

СВЕДЕНИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.07.2001 за № 101484246.

Юридический адрес и местонахождение предприятия: 220114, г. Минск, пр-т Независимости, д. 173, пом. 215-4, тел./факс: (017) 302 84 10/15.

Офис продаж: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, офис 210, тел.: +375 (29) 340 05 40, +375 (33) 340 05 40.

Режим работы офиса продаж: понедельник – четверг с 9.00 до 18.30, пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв – с 12.45 до 13.30.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, с указанием информации о фактических сроках строительства данных объектов:

- жилой дом № 123 по пр-ту Дзержинского в г. Минске – 64 мес.;
- жилой дом № 45 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 23 мес.;
- жилой дом № 47 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 27 мес.;
- жилой дом № 49 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 25 мес.;
- одноквартирные жилые дома №№ 4, 6, 6А, 8, 8А, 10, 10А, 12, 12А, 14, 14А, 16, 16А по ул. Ратомской – 19 мес.;
- жилые дома №№ 18, 20 по ул. Ратомской – 23 мес.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Цель строительства – строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского».

Срок начала строительства объекта – 09 августа 2018 года. Нормативная продолжительность строительства – 24 месяца. Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода его в эксплуатацию – 4-й квартал 2024 года.

Строительство осуществляется на основании:

- решений Минского городского исполнительного комитета от 07.06.2018 г. № 1866 и от 30.09.2021 г. № 2926;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу (заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» № 76-15/18 от 22.03.2018 г., № 164-15/19 от 24.05.2019 г., № 71-15/22 от 24.03.2022 г., № 71-15/22-Д1 от 31.03.2022 г., № 71-15/22-Д2 от 15.06.2022 г., № 146-15/23 от 06.04.2023 г.;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и прав на него № 500/249-13446 от 17.05.2023;
- договора строительного подряда на строительство объекта № 1М-ГП от 30.03.2022 г., заключенного с ООО «ТАПАС ПЛЮС»;
- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 09.08.2018 № 2-203Ж-031/18.

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Земельный участок для строительства объекта расположен в Московском районе г. Минска в границах: с северо-запада – улицей Розы Люксембург и ранее сложившейся жилой застройкой средней этажности, с юго-востока – проспектом Дзержинского с расположенным вдоль проспекта отелем «Ренессанс Минск», а также бизнес-центром. Земельный участок общей площадью 0,4945 га предоставлен застройщику во временное пользование для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского».

Объект представляет собой многоквартирный жилой дом комфортной категории проживания со встроено-пристроенными помещениями и гаражом-стоянкой закрытого типа. Жилой дом совместно со встроенными помещениями и гаражом-стоянкой образует единый 23-этажный комплекс, с техническим чердаком и цокольным надземным этажом. Высота здания – 74.2 м. Здание состоит из разноэтажных объемов, в которых размещены различные по функциональным группам помещения:

- основной (высотный) 23-этажный объем в осях 1-7, А-Ж с размерами в плане по крайним осям 21.25 х 22.7 м. В нем размещены жилая часть и медицинский центр;
- к основному объему пристроена неотапливаемая гараж-стоянка закрытого типа, решенная в два уровня с раздельными въездами-выездами. В пристроенной части также размещены офисные помещения и расчетно-кассовый центр. Объем имеет сложную в плане форму габаритами в крайних осях 1/1-16/1 и А/1-С/1 68.7х47.6м;
- смежно с гаражом-стоянкой размещены два отдельных здания: трансформаторная подстанция и повысительная насосная станция;
- кровля пристроенной части – эксплуатируемая, плоская совмещенная, с внутренним водостоком, решена в несколько уровней с переходными лестницами;
- кровля высотной части – плоская совмещенная, неэксплуатируемая, с внутренним водостоком.

Конструктивная схема здания **жилого дома** – монолитный железобетонный рамно-связевый каркас. Наружные ограждающие стеновые конструкции – вентфасад из алюминиевых кассет на подсистеме стальных профилей с остеклением и заполнением глухих участков минераловатными плитами, участки наружных стен – монолитные железобетонные. Внутренние стены – монолитные железобетонные. Перегородки – из блоков керамзитобетона толщиной 100 мм. Оконные проемы, остекление лоджий – структурное остекление с заполнением стеклопакетами. На лоджиях предусмотрено не менее 50 % открывающихся створок. Открывающиеся створки окон оборудованы детскими замками безопасности. Заполнение глухой подоконной части остекления принято высотой не менее 1,1 м из многослойного безопасного стекла. Двери из алюминиевого профиля, стальные.

Принятая высота этажей в отметках чистого пола:
- цокольный этаж – (переменная) 2,66…4,95 м;
- 1-й этаж – (переменная) 2,4…4,1 м;
- жилые этажи 2-19 – 3,15 м;
- жилые этажи 20- 23 – 3,6 м;
- технический чердак – 2,35; 3,7 м (в чистоте).

Всего квартир в доме – 96, в том числе: 1-комнатных – 41, 2-комнатных – 42, 3-комнатных – 13.

В здании запроектированы 3 лифта грузоподъемностью 1000 кг.

Гараж-стоянка запроектирован в два уровня закрытого типа на 111 машиномест. Въезды (выезды) организованы по прямолинейным двухпутным рампам. На каждом уровне предусмотрено устройство зарядных станций для электромобилей и машиномест для транспорта маломобильных лиц. При постановке автомобилей перпендикулярно ограждающим конструкциям и вдоль рамп предусмотрено устройство колесоотбойников. Полы запроектированы с уклоном к водоотводящим устройствам. На въездах предусмотрена установка ворот.

Наружная отделка:

- стены – вентфасад с облицовкой алюминиевыми кассетами; витражное остекление; сэндвич-панели; легкая штукатурная система; ламели.

Внутренняя отделка помещений общего пользования: стены – декоративная штукатурка, потолки – покраска, подвесные потолки; покрытие пола – керамическая плитка.

В квартирах и встроенных помещениях предусмотрена подготовка под отделку (полы со звукоизоляцией и цементно-песчаной стяжкой, стены – улучшенная штукатурка; потолки – заделка швов, выравнивание поверхности).

Объект оборудуется всеми необходимыми инженерными системами и оборудованием согласно проектной документации: предусматриваются отдельные системы отопления для жилых помещений и для встроенных помещений.

В жилом доме предусматриваются отдельные ветки систем отопления для мест общего пользования, лестничных клеток, технических помещений на отм. -2,680. В качестве отопительных приборов предусматриваются: низкопольные конвекторы с нижним подключением для жилых помещений, стальные панельные радиаторы для остальных помещений. Для жилых помещений проектом предусматривается приточно-вытяжная вентиляция с естественным и механическим побуждением движения воздуха.

В жилом доме запроектированы следующие системы внутреннего водоснабжения и канализации: отдельные зонные системы внутреннего хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения (1 зона – 1–6 этажи; 2 зона – 7–23 этажи), отдельная система противопожарного – водопровода – (система – АПТ), отдельные – системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения встроенных помещений; системы бытовой канализации и внутренних водостоков; дренажная система (от кондиционеров).

В жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, ИТП, электрощитовая, коридоры общего пользования, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, кровля, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников, элементы озеленения и благоустройства дворовой и прилегающей к жилому дому территории.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения после приемки в эксплуатацию представителю товарищества собственников, а если на момент приемки в эксплуатацию объекта товарищество собственников не будет создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков или уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Комплексное благоустройство территории включает в себя устройство проездов и парковок, пешеходных тротуаров и дорожек, устройство детских и спортивных площадок, оборудование территории малыми архитектурными формами, устройство хозяйственной площадки для ТКО, озеленение территории.

Финансирование элементов благоустройства территории производится участниками строительства жилого дома.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагаются:

1) 3 квартиры, расположенные на 2-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 92,73 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4250 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 84,44 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4250 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 57,87 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4250 белорусских рублей;

2) 4 квартиры, расположенные на 3-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 92,73 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4500 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 54,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5200 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 86,08 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4500 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 58,69 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5200 белорусских рублей;

3) 2 квартиры, расположенные на 4-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,10 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4600 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5250 белорусских рублей;

4) 2 квартиры, расположенные на 5-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 96,42 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4600 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,75 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4600 белорусских рублей;

5) 3 квартиры, расположенные на 6-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 96,42 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4650 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 56,73 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5500 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 54,06 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5500 белорусских рублей;

6) 1 квартира, расположенная на 12-м этаже жилого дома, в том числе:
- однокомнатная квартира общей площадью 61,05 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5700 белорусских рублей;

7) 1 квартира, расположенная на 13-м этаже жилого дома, в том числе:
- трехкомнатная квартира общей площадью 117,79 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5100 белорусских рублей;

8) 1 квартира, расположенная на 16-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5180 белорусских рублей;

9) 1 квартира, расположенная на 16-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5250 белорусских рублей;

10) 3 квартиры, расположенные на 18-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5300 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5500 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,54 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6000 белорусских рублей;

11) 3 квартиры, расположенные на 19-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5400 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5600 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5750 белорусских рублей;

12) 3 квартиры, расположенные на 20-м этаже жилого дома, в том числе:
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5900 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6100 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,54 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6550 белорусских рублей;

13) 3 квартиры, расположенные на 21-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6500 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 206,38 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6700 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,53 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6750 белорусских рублей;

14) 3 квартиры, расположенные на 22-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6700 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 206,38 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6750 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,53 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7000 белорусских рублей;

15) 4 квартиры, расположенные на 23-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7400 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7400 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7400 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7700 белорусских рублей;

16) 20 машино-мест в гараж-стоянке жилого дома. Стоимость строительства машино-места составляет 40 000 белорусских рублей;

17) 3 административных помещения, в том числе:
- расчетно-кассовый центр общей площадью 121,53 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади расчетно-кассового центра составляет 7700 белорусских рублей;
- медицинский центр общей площадью 311,2 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади расчетно-кассового центра составляет 6900 белорусских рублей;
- помещение офисов общей площадью 312,2 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади помещения офисов составляет 6000 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения и иных факторов, влияющих на стоимость.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

Условия оплаты

Оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно (в течение 5 (пяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме) либо в установленный договором период по графику платежей.

Для подачи заявления и заключения договора необходимы:

- для физического лица: личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор, с паспортом или его представителя. Документы представителя – паспорт, доверенность, оформленная в установленном законодательством порядке, копия паспорта, копия доверенности;
- для юридического лица: личное присутствие руководителя юридического лица, с которым будет заключаться договор, или его представителя. Документы – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица, копия Устава юридического лица, документ, подтверждающий полномочия на представление интересов.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 25.01.2024 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-этаж, ООО «Агентство недвижимости «Мегаполис». Время работы: понедельник–пятница – 9.00–18.30 без обеда. Суббота, воскресенье – выходной.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, а также о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-этаж, ООО «Агентство недвижимости «Мегаполис».

Тел. +375 29 3400540.

Уважаемые акционеры ОАО «Элегант»! По решению Наблюдательного Совета Общества **годовое общее собрание акционеров ОАО «Элегант» состоится 12 марта 2024 года в 15.00** по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, 2-й этаж, бухгалтерия

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2023 году и основных направлениях деятельности Общества на 2024 год.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2023 год, отчета о прибылях и убытках за 2023 г.
4. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2023 год, о выплате дивидендов за 2023 г.
5. Об утверждении основных направлений распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества в 2024 году и первом квартале 2025 г.
6. Об утверждении прочих расходов за счет прибыли 2023 года, в т. ч. списание кредиторской и дебиторской задолженностей с истекшим сроком исковой давности.
7. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении количественного состава членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
9. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
10. О решениях, принятых наблюдательным советом Общества.

Форма проведения собрания – очная.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 19.02.2024 г.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия, ежедневно с 21.02.2024 г. с 9.00 до 16.00 и в день проведения собрания с 09.00 до 14.00.

Тел. (01775) 6-80-74.

Начало регистрации 12.03.2024 года с 14.00 до 14.45 при предъявлении паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность; для доверенных лиц – доверенность, заверенная в установленном порядке, а также паспорт либо иной документ, удостоверяющий личность по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия.

УНН 600039318

Дзейныя асобы

ЖЫЦЬ — ЗНАЧЫЦЬ СЛУЖЫЦЬ, БЫЦЬ КАРЫСНЫМ ЛЮДЗЯМ

У нас, Друянаў, гэта, падобна, у крыві

Цікавая лічба: на працягу амаль сарака гадоў Гомельскі абласны шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ўзначальвалі Друяны — спачатку бацька, потым сын. Абодва — заслужаныя ўрачы Рэспублікі Беларусь, кандыдаты медыцынскіх навук, дацэнты, ардэнаносцы... Да таго ж Друян старэйшы — Ібрагім Леанідавіч і яго жонка Марыя Лявонцьеўна — ветэраны вайны і, можна сказаць, заснавальнікі цэлай дынастыі медыкаў з агульным працоўным стажам каля двухсот (!) гадоў — тры пакаленні. Гутарым з прадстаўніком другога з іх — сярэдняга.

— Леанід Ібрагімавіч, у Беларусі, мусіць, няма больш такой дынастыі і няма ўстановы, якую б столькі гадоў узначальвалі бацька і сын. Для вас выбар прафесіі быў заканамернасцю?

— Я не фаталіст, але ж давайце разважаць. Калі б недзе з сёмага класа я не стаў наведвацца да бацькі на работу, не бачыў яго ў справе, не марыў таксама стаць доктарам, дык і не стаў бы. У маім характары змалку не было імкнення рвацца наперад, настырна заяўляць пра сябе... Тым не менш школу я скончыў з залатым медалём, у час вучобы не цураўся і грамадскіх спраў. Тое ж было і ў інстытуце. А пасля яго — работа тэрапеўтам у адной з паліклінік, цэхавым урачом на станкабудаўнічым заводзе, служба ў войску, завочная вучоба ў аспірантуры, выкладанне на кафедры медпадрыхтоўкі, паўстаўкі ўрача-тэрапеўта ў шпіталі інвалідаў вайны, абарона кандыдацкай дысертацыі, пасля якой паступіла прапанова ўзначаліць шпіталь.

Гэты шлях — угару, уверх па прыступках — вынік вялікай асабістай працы. Маё выхаванне было пастаўлена так, каб усё спасцігаў я сам. Бацькі змалку прывучалі да любой справы ставіцца адказна і добрасумленна, да любога чалавека — з павагай. Тады, маўляў, будуць і прызнанне, і пашана і як вынік — пасада.

— То-бок вы лічыце, што само жыццё ўсё і ўсіх расстаўляе на свае месцы?

— Напэўна, так. Хаця ў жыцці майго бацькі рашаючую ролю мелі як заканамернасці, так і выпадковасці, аб чым ён, напэўна, нават не задумваўся. Проста рос у беднай армянскай сям'і, за тры кіламетры хадзіў у школу-сямігодку, падчас вучобы ў Керчанскім металургічным тэхнікуме перабіваўся з квасу на хлеб, бо стыпендыі не хапала, а дапамогі проста не было — пастаянна шукаў падпрацоўку... Горш за тое, пасля выторчай практыкі на заводзе студэнт зразумеў, што будучая прафесія не для яго, і паступіў у Днепрапятроўскі медыцынскі інстытут. Апошні экзамен (і, дарэчы, на выдатна) ён здаў 21 чэрвеня 1941 года, спадзяваўся прыступіць да працы і прыступіў... Хоць зусім не да той, на якую разлічваў. Праз некалькі дзён доктар Ібрагім Друян апынуўся на пасадзе начальніка эвакуацыйнага аддзялення палявога шпіталя, які перамясціўся ў Жытомір… Казаў, што медыкі там не спалі суткамі — столькі было параненых...

Потым прыйшоў загад рухацца далей — у бок Кіева, але страты ад бамбардзіровак былі настолькі вялікімі, што перасоўныя шпіталі давялося расфарміраваць, а медыкаў адправіць на перадавую.

Для бацькі гэта быў 193 кулямётны батальён Кіеўскага ўмацаванага раёна, адступленне ўглыб краіны, зноў налёты нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў, і разгром калоны... Апрытомнеўшы пасля ранення, бацька ўбачыў перад сабой групу нямецкіх аўтаматчыкаў.

Пасля гэтага быў палон, паўгода амаль канцлагернага рэжыму з пастаянным голадам, маральнымі і фізічнымі здзекамі, невыносна цяжкай працай і пастаяннымі думкамі пра ўцёкі.

Першая ж спроба для некалькіх чалавек скончылася расстрэлам. Бацьку цудам пашчасціла выжыць і пазней трапіць у партызаны.

Расказваў, што атрад іх быў зусім невялікі, аднак ворагу шкодзіў нямала. Немцы не раз спрабавалі расправіцца з народнымі мсціўцамі, што няцяжка было зрабіць ва ўмовах украінскага рэдкалесся... Таму летам 1942-га, адолеўшы нялёгкі шлях, атрад перабазіраваўся ў лясы Беларусі...

— Бацька прымаў удзел у баях, у сутычках з немцамі ці больш, як урач-хірург, стаяў за аперацыйным сталом?

— І тое, і другое. З інструментаў — казаў — быў толькі нож (звычайны, кухонны), іголка, ніткі, пацыенту — шклянка першаку для наркозу. Гэта ў пачатку. З часам бацька ўзначаліў санітарную службу партызанскай брыгады імя Гуляева, стаў адным з арганізатараў медыцынскай службы Мінскага партызанскага злучэння і вельмі многага змог дабіцца. Па яго прапанове былі пабудаваны спецыяльныя зямлянкі для параненых і хворых, для правядзення аперацый, адкрыты лазні, арганізаваны збор лекавых траў....

Якраз гэта справа і звяла майго бацьку доктара Ібрагіма Друяна з медсястрой Палескага партызанскага злучэння Марыяй Вежнавец.

Нейкі час яны перапісваліся (бо атрады знаходзіліся на вялікай адлегласці), а потым атрымалі дазвол камандзіраў (такія былі парадкі) на шлюб. Кіраўнік партызанскай брыгады Герой Савецкага Саюза Фёдар Іларыёнавіч Паўлоўскі разлічваў, што доктар Друян перабярэцца да Марыі, і ў брыгадзе з'явіцца выдатны доктар. Але ж тата хацеў, каб жонка перабралася ў яго атрад... Так яно ўрэшце і вышлла: бацькаў шпіталь папоўніўся кваліфікаванай медсястрой.

— Адкуль была родам ваша матуля? Як яна трапіла ў партызаны?

— Марыя Лявонцьеўна паходзіла з вёскі Пратасы былога Парыцкага раёна, да вайны ў Бабруйску скончыла школу медсясцёр...

Яе старэйшы брат Рыгор пасля ваеннага вучылішча служыў у Чырвонай Арміі,

трапіў у акружэнне, вызваліўся, вярнуўся дамоў і адразу папярэдзіў сям'ю, што пойдзе ў партызаны. Марыя пайшла следам.

— Спачатку — следам за братам, потым — следам за мужам, праз усё жыццё...

— Так... Адразу пасля вызвалення Беларусі мае бацькі працавалі на Камянеччыне. Дарэчы, па дарозе туды ў ліпені 1944-га ім давялося заначаваць у нейкім будане і трапіць там пад абстрэл (па лясах яшчэ блукалі недабітыя фашысты ды іх памагатыя)... У мамы пачаліся роды, і прымаць іх давялося бацьку.

З 1952 года па 1960-ы ужо ў Гомелі ён працаваў начальнікам медчасці шпіталя інвалідаў вайны, потым узначаліў яго і вельмі шмат зрабіў. Пры ім былі пабудаваныя новая сталовая, водалячэбніца, гаражы, пацыентаў-інвалідаў сталі навучаць іншым прафесіям — майстра па рамонце гадзіннікаў, абутка, кінамеханіка і г. д. Заслугі бацькі былі настолькі значнымі, што ў Цэнтральным медыцынскім музеі Ленінграда яго дзейнасці была прысвечана спецыяльная экспазіцыя.

— Пасля Ібрагіма Леанідавіча шпіталь узначалілі вы — Друян малодшы, Леанід Ібрагімавіч. Прызнайцеся: мела месца пратэкцыя?

— Не! Яе нават быць не магло, хоць бы таму, што шпіталь я ўзначаліў у 1990-м, а бацькі не стала ў 1988-м.

— Тым не менш вы прадоўжылі яго справу. Раскажыце, што ўдалося зрабіць?

— Пералік будзе доўгім. Пачну з таго, што калі заступіў на пасаду, шпіталь меў адзін корпус на 220 ложкаў і ў калектыве працавала 280 чалавек. Калі ў 2008-м перахадзіў на іншую работу, лічбы «падскочылі» адпаведна да 600 і 500... Ішло будаўніцтва новых карпусоў, ствараліся новыя аддзяленні — пасляінсультнае і пасляінфарктнае, траўматалагічнае, рэабілітацыйнае, прымяняліся новыя тэхналогіі лячэння і дыягностыкі. Вялікую ўвагу мы надавалі безбар'ернаму асяроддзю — рабілі ўсё, каб пацыенты-калясачнікі маглі самастойна наведваць любы кабінет, «выязджаць» за межы памяшканняў. У новых карпусах у кожнай палаце прыбіральня, умывальнік, і ўсё ж...

Калі ў Гомелі адкрываўся медыцынскі ўніверсітэт, я, у адрозненне ад большасці галоўных урачоў бальніц і паліклінік, горача падтрымліваў рэктараў гэтай ВНУ, якія стаялі за тое, каб на базе шпіталя і ўніверсітэта ў звязцы практыкі і навукі дзейнічала клінічная ўстанова. Што ўрэшце атрымалася і дае цяпер добры плён...

Мне вельмі прыемна, што шпіталь працягвае развівацца пад умелым кіраўніцтвам Алега Анатолевіча Іванцова.

— Леанід Ібрагімавіч, пытанне, як той казаў, «на засыпку». Вашы бацькі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, многімі медалямі і Ганаровымі граматамі, вы, заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь, — ордэнам «Знак Пашаны»… Сёлета вам споўніцца восемдзясят. Пенсійны ўзрост. У такім вельмі многім і даўно — на сапраўды заслужаным адпачынку. Вы па-ранейшаму працуеце. Спакой вам толькі сніцца?

— Не *(з усмешкай)*, не сніцца. Ужо 30 гадоў я працую дацэнтам кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб Гомельскага медуніверсітэта. За гэты час выступіў аўтарам ці суаўтарам 11 кніг, у свае 74 вырашыў заняцца вывучэннем англійскай мовы і ўжо тры гады навучаю на ёй замежных студэнтаў...

Дарэчы, ва ўніверсітэце было арганізавана інтэрнэт-галасаванне з мэтай вызначыць найлепшых выкладчыкаў. Што вельмі прыемна, студэнты назвалі мяне… Так што пакуль дазваляе здароўе, ад работы адмаўляцца не збіраюся. Жыць — значыць служыць, быць карысным людзям. У нас, Друянаў, гэта ў крыві.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ,
г. Гомель.

Пад кніжнымі ветразямі

Кніга — з'ява асаблівая. Гэта і частка культуры, інструмент выхавання духоўнасці, і адначасова — тавар, у якога ёсць свае вытворцы і спажыўнікі. Як сёння беларуская кніга даходзіць да пакупніка, якія навінкі варта пашукаць на паліцах кнігарань? Пра гэта гаварылі з журналістамі кнігавыдаўцы і кнігараспаўсюджвальнікі на сустрэчы ў прэс-цэнтры Дома прэсы, якая мела назву «Белкніга» як флагман кніжнага гандлю: вынікі і перспектывы».

ААТ «Белкніга» здзяйсняе оптава-рознічны гандаль кніжнай і іншай друкаванай прадукцыі, якая выпускаецца ў Беларусі і за яе межамі, на розных мовах, а таксама канцылярскімі і офіснымі прыладамі, аказвае паслугі захоўвання друкаванай прадукцыі на тэрыторыі нашай краіны.

— Мы з Саюзам пісьменнікаў Беларусі даўно і вельмі шчыльна працуем і ўзаемадзейнічаем па ўсіх кірунках. Гэта прасоўванне беларускай літаратуры, правядзення розных мерапрыемстваў, арганізацыя сустрэч, пытанні фарміравання кніжнага рынку нашай краіны з пункту гледжання дзяржаўных прыярытэтаў, дзяржаўнай інфармацыйнай і культурнай палітыкі, — адзначыў **генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір МАТУСЕВІЧ.**

За мінулы год прадпрыемства дасягнула пэўных вынікаў: у няпростых канкурэнтных эканамічных умовах змагло захаваць прыбытковую працу і фінансавую стабільнасць.

— Выручка і тавараабарот у нас таксама падраслі, — падзяліўся Уладзімір Матусевіч. — Агульны рост тавараабароту сёння ў нас дасягае больш за 51 мільён. І больш за 104 працэнты — тэмп росту ў параўнанні з мінулым годам.

Сёння пад кіраўніцтвам ААТ «Белкніга» 89 гандлёвых аб'ектаў, з якіх 16 — у Мінску, тры кіёскі ў навучальных установах, а ўсе астатнія — у рэгіёнах.

— Мы захоўваем рэгіянальную кніжную сетку кнігагандлю, разумеючы, што гэта вельмі важна з пункту гледжання прасоўвання кніг у абласцях, раёнах нашай краіны, — дадаў дырэктар ААТ «Белкніга». — Магчымасць забяспечыць недзе ў крокавай даступнасці, але ў любым выпадку добрай геаграфічнай даступнасці для чытачоў, каб яны маглі знайсці кнігу і пры жаданні набыць яе.

Таксама прадпрыемства займаецца прасоўваннем беларускай кнігі за мяжу, найперш у Расію. Яшчэ летась ААТ «Белкніга» ўстанавіла добрыя партнёрскія адносіны з Домам кнігі Санкт-Пецярбурга і кніжны абмен з Іркуцкам. Найбольшым попытам у Расіі карыстаюцца кнігі пра Беларусь рознай накіраванасці: пра яе культуру, традыцыі і гісторыю. Не адстаюць па запатрабаванасці вытворча-практычная літаратура і мастацкая літаратура як на беларускай, так і на рускай мове.

Таксама на прэс-канферэнцыі выступіў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.** Ён адзначыў, што ёсць цэлы шэраг супольных ідэй з ААТ «Белкніга», якія выяўляюцца не толькі ў прэзентацыях, але і ў тым, што на паліцах кнігарань так ці інакш выдзяляюцца кнігі, выдадзеныя Саюзам пісьменнікаў Беларусі і ВД «Звязда».

Самыя цікавыя кніжныя навінкі розных тэм і жанраў былі прадэманстраваны журналістам. Напрыклад, кніга вядомага расійскага пісьменніка Мікалая Чаркашына «Генералы сорак першага года». Ён стварыў цыкл, які прысвечаны падзеям на тэрыторыі Беларусі ў 1941 годзе, яркa паказаў мужнасць салдат, чырвонаармейцаў, афіцэраў. Дарэчы, гэта другі раман з яго цыкла.

Таксама варты ўвагі «Галавасек» Анатоля Бензерука.

— Гэта кніга створана ў межах той працы, якую праводзяць літаратары па мастацкім выкладанні ўсіх пытанняў, звязаных з генацыдам беларускага народа, — адзначыў Алесь Карлюкевіч.

Аўтар жыве ў Жабінцы, працуе ў жабінкаўскім дадатку да абласной газеты «Заря». Ён збіраў матэрыял пра вёску Драмлёва Жабінкаўскага раёна на працягу 10 гадоў. У выніку атрымаўся цікавы дакументальна-мастацкі твор, заснаваны на дакументальных сведчаннях.

Таксама старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі заўважыў, што шмат увагі ўдзяляецца пошуку сучасных аўтараў, якія працуюць на мяжы публіцыстыкі і мастацкай літаратуры. Сярод іх — доктар педагагічных навук, рэктар БДУ Андрэй Кароль з кнігай «Дарогі vs Сэнсы» і беларускі прадзюсар Алеся Кузняцова са сваім дэбютным раманам «Калі трашчыць лёд».

Да таго ж, па словах Алеся Карлюкевіча, выдавецтва актыўна супрацоўнічае з журналістамі і публіцыстамі. Днямі будзе надрукавана кніга супрацоўнікаў Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» «Ведаем, ганарымся!» Ірыны Аўсеп'ян і яе мастацкага суаўтара Алега Карповіча. Выданне складаецца з нарысаў і мастацка-дакументальных партрэтаў вядомых людзей Беларусі. Прэзентацыя кнігі адбудзецца на XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Грані

МОДНАЕ ШОУ Ў КУПАЛАЎСКІМ

Як мода становіцца мастацтвам?

24 лютага на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адбудзецца моднае культурна-відовішчнае мерапрыемства Modern Culture View Fashion Art Week. Для чаго на Купалаўскую сцэну паднімуцца дызайнеры і мадэлі, навошта гледачу купляць квіткі на гэтае мерапрыемства і чаму ўвогуле пра гэту падзею «Звязда» вырашыла напісаць?

Пачнём з адказу на апошняе пытанне. Ну, па-першае, пасля навагодняга «ўсплёску» з яркімі і відовішчнымі мерапрыемствамі ўзімку ў нашых шыротах традыцыйнае зацішша. І калі хочацца акунуцца ў святло сафітаў, музыку і свята, модны паказ напрыканцы апошняга, самага цёмнага і (па адчуваннях, а не па каляндарнай арыфметыцы) доўгага зімовага месяца — якраз тое што трэба. Тым больш што арганізатары абяцаюць разнапланавае шоу, дзе будзе цікава і высокакультурным эстэтам, і аматарам моды, і тым, хто «проста прыйшоў паглядзець». А па-другое (і галоўнае), праект гэты, як расказаў адзін з яго аўтараў, **член Беларускага саюза дызайнераў Іван КАРАТКЕВІЧ**, сваёй задачай бачыць упісаць беларускую моду ў кантэкст сучаснага мастацтва і культуры нашай краіны як паўнапраўную прадстаўніцу.

МУЗЫ Ў САЮЗЕ

Мода, кароткачасовае панаванне пэўных густаў і пераваг (галоўным чынам у адзенні), у трэцім тысячагоддзі пазіцыяную сябе не як нешта мімалётнае і несур'ёзнае. У нашы дні гэта складаная шматгранная з'ява, якая прэтэндуе на месца ў сучасным мастацтве, падкрэсліваючы сваю важкую ролю ў розных сферах дзейнасці — ад «дызайну» знешнасці людзей і асяроддзя іх існавання да сур'ёзнага ўплыву на эстэтыку нашага жыцця (бо шмат у чым менавіта мода вызначае для кожнага пакалення, што лічыць прыгожым і вытанчаным, а што — безгустоўным), архітэктуру, бізнес, індустрыю, навуку і эканоміку.

І як від мастацтва, мабыць, мода сапраўды бліжэй за ўсё да тэатра. Бо яна не існуе без гледача. Дэманстратыўнасць, спаборнічанне, пераўвасабленне, акцёрская ігра (прымяраючы на сябе розныя модныя вобразы, можна «прыкінуцца» кім захочаш) — усё гэта элементы тэатра. Хоць ад тэатра моду адрознівае «ўбудаванасць» у сучаснасць, прамая сувязь са зменлівымі настроямі людзей, яе суперактуальнасць «тут і цяпер».

Пры гэтым, нягледзячы на сваю ўтылітарнасць і прыкладны характар, мода, як і выяўленчае мастацтва або скульптура, харэаграфія або музыка, здольная выказваць абстрактныя думкі і ідэі. Дызайнеры жывуць тым жа жыццём, што і «адрасаты» іх творчасці, ходзяць па тых жа вуліцах, чытаюць тыя ж кнігі і глядзяць тыя ж фільмы і навіны, бываюць на тых жа выставах і канцэртах, п'юць каву ў тых жа кафэ. А іх калекцыі — гэта іх уражанні і асабістыя разважанні, іх бачанне таго, што адбываецца вакол. Гледачу застаецца толькі «расшыфраваць мэсэдж».

— 24 лютага Fashion Art Week будзе праходзіць ужо дзявяты раз, — расказвае аўтар і кіраўнік модных культурна-відовішчных праектаў Іван Караткевіч. — А пачынаўся праект з таго, што, прааналізаваўшы рынак, мы зразумелі: хочацца нашу беларускую моду падняць на іншы ўзровень у плане

ўсведамлення грамадствам яе каштоўнасці. У першым праекце бралі ўдзел зусім маладыя перспектыўныя дызайнеры Беларусі. Modern Culture View быў задуманы як сучасны погляд на культурна-відовішчнае шоу, якое аб'ядноўвае выканаўцаў з розных галін мастацтва. Упершыню гэта былі мода, харэаграфія, музыка, вакал і тэатр. Цяпер — ужо трэці сезон запар — прыцягваем таксама выяўленчае мастацтва і скульптуру. А Купалаўскі тэатр у якасці галоўнай пляцоўкі праекта мы выбралі першапачаткова. І хачу сказаць вялікі дзякуй кіраўніцтву і калектыву Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы за тое, што яны паверылі і працягваюць верыць у наш праект.

МАГЧЫМАСЦЬ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ ДЭТАЛІ

Калі мода — від мастацтва, то і модныя паказы даўно перасталі праходзіць толькі на подыумах. Сёння гэта тэатралізаваная дзея, перформанс, частка паўсядзённага жыцця — у залежнасці ад задач і калекцый. Неверагодныя дэкарацыі і рэжысёрскія рашэнні, нечаканыя і нават часам «непрыдатныя» для модных паказаў лакацыі працуюць на тое, каб гледачу лягчэй было расшыфраваць закладзеныя дызайнерамі ў калекцыі філасофскія ідэі. Зрэшты, часта задачы больш празаічныя — проста «каб запомнілі». Проста здзівіць і ўразіць, парадаваць, пацешыць, а часам і эпаціраваць гледача. Але хіба ж гэта дрэнна?

Адным з піянераў новай канцэпцыі арганізацыі модных паказаў стаў легендарны Ів Сэн-Ларан. 12 ліпеня 1998 года тры сотні мадэляў у калекцыях Yves Saint Laurent дэфіліравалі па стадыёне «Стад дэ Франс» падчас фіналу чэмпіянату свету па футболе пад «Балеро» кампазітара Морыса Равеля.

Далей — больш. Паказы модныя дамы праводзілі ў авіяцыйных ангарах і ў вялізных заводскіх цэхах, на гандолах і караблях, проста на вуліцах вялікіх гарадоў важна, таму што для поўнага ўспрымання работы дызайнераў гледачам неабходны не толькі агульны выгляд, але і дэталізацыя. Адна з дарожак, па якой пойдуць мадэлі, ідзе ў залу, а частка гледачоў будзе сядзець проста на сцэне.

Шоу дасць магчымасць убачыць адначасова не менш за 30 калекцый беларускіх дызайнераў, маладых і тых, хто ўжо зрабіў імя (хоць, магчыма, іх будзе больш — на першым паказе, напрыклад, калекцый было 50). Да беларускіх калег сёлета далучацца расійскія дызайнеры. Акрамя таго, свае новыя калекцыі прывязуць у Мінск два італьянскія брэнды, расказала **член савета Беларускага саюза дызайнераў, куратар праектаў у сферы моды і мастацтва Вольга ЗЯМСКОВА.** Італьянскія дызайнеры прыязджаюць у Беларусь пры падтрымцы Гандлёва-прамысловай палаты, дадала яна.

Праект зойме цэлы дзень. Паказы будуць праходзіць у рэжыме нон-стоп, на сцэну выйдуць як мадэлі зусім юныя (дзіцячыя і падлеткавыя калекцыі будуць дэманстравацца ў дзённым блоку), так і дарослыя, а таксама мадэлі 50+ (дарослыя калекцыі — вячэрні блок).

У кожнага Fashion Art Week па традыцыі ёсць тэма, якая шмат у чым вызначае канцэпцыю паказаў. У мінулым сезоне гэта былі «Пачуцці і Эмоцыі».

(калі для моднага шоу ўладам даводзілася перакрываць вулічны рух). Так што тэатральная сцэна — далёка не самы эксцэнтрычны выбар для моднага шоу.

— Само мерапрыемства мы не называем «паказ», не абмяжоўваем яго гэтым словам, — падкрэслівае Іван Караткевіч. — У нас усё звернута ў тэатралізацыю. На мінулых паказах, напрыклад, выкарыстоўвалі магчымасці і эфекты тэатральнай сцэны, якімі падыум не валодае.

— Тэатральная пляцоўка дазваляе гледачу пры паказе калекцый разглядзець нават дэталі, — дадае пастаноўшчык фэшн-шоу Алена Кавальчук. — Гэта вельмі У цяперашнім — шматгранае і складанае паняцце «Імёны».

І ДЛЯ ГЛЕДАЧА, І ДЛЯ МАСТАКА

Такім чынам, па задумцы арганізатараў, глядач павінен акунуцца ў атмасферу, якая ствараецца перапляценнем розных відаў мастацтва, кожны з якіх адлюстроўвае тую ці іншую грань сучаснай беларускай культуры. Калекцыі дызайнераў як бы «уплецены» ў гэта агульнае палатно. Сёлета акцэнт — на выяўленчым мастацтве і скульптуры.

— Прапанову аб удзеле ў гэтым мерапрыемстве я прыняў з радасцю, — кажа **скульптар і дызайнер, член Беларускага саюза дызайнераў і Беларускага саюза мастакоў Максім ПЯТРУЛЬ.** — Я прафесійна займаюся скульптурай, мае творы знаходзяцца ў розных гарадах і краінах свету, і мерапрыемства з дапамогай відэараду і мадэляў маіх работ дае гледачу магчымасць азнаёміцца з маёй творчасцю.

Заўважым, што Максім Пятруль стварaў для станцый мінскага метро і ўпрыгажэння сталічных вуліц, нямала яго работ знаходзіцца за мяжой — у прыватнасці, упрыгожваюць вуліцы кітайскіх гарадоў. Манументальныя скульптурныя творы не той маштаб, каб лёгка было сабраць «творчую спадчыну» на адной выставе. Максім Пятруль аўтар каля 25 такіх твораў, і мерапрыемства, якое дазваляе ўбачыць «усё і адразу», каштоўнае і для гледача, і для мастака.

— Акрамя таго, трэба падтрымліваць маладзёжныя ініцыятывы, — пераканаў майстар. — Калі я пачынаў працаваць, мяне падтрымлівалі выдатныя людзі. Напрыклад, Віктар Уладзіміравіч Крамарэнка, адзін з аўтараў Нацыянальнай бібліятэкі, ці легенда беларускай архітэктуры, адзін з аўтараў мемарыяла «Хатынь» Леанід Мендзелевіч Левін. Хто, акрамя нас саміх, будзе падтрымліваць нашу культуру, нашу моладзь? Як бы патэтычна гэта ні гучала, важна ствараць сучасную беларускую культуру — кожнаму і кожны дзень. Так, у нашай культуры ёсць карані, вытокі, але яна не толькі тое, што было калісьці. Цяпер яна таксама ствараецца, таксама адбываецца. І ад нас залежыць, якой ёй быць.

— Калі я ўдзельнічала ў праекце Modern Culture View Fashion Art Week упершыню, для мяне гэта быў найчысцейшы эксперымент, — кажа **мастак, член Беларускага саюза мастакоў Марыя БАРЫСЕНКА.** — Не ўяўляла, што з усяго гэтага атрымаецца. Атрымаліся новыя гарызонты для ўспрымання: сінтэз мастацтваў, якія, здавалася б, наўпрост не пераклікаюцца.

Гэтым разам, расказалі арганізатары, яны хацелі б пашырыць колькасць удзельнікаў, якія прадстаўляюць розныя віды выяўленчых мастацтваў. У ідэале кожны ўдзельнік прадставіць усяго па адной сваёй рабоце. Але гэта яшчэ будзе абмяркоўвацца.

— Такі фармат дае магчымасць прадставіць свае работы больш шырокай аўдыторыі, — адзначае Марыя Барысенка.

Пагадзіцеся, галерэі і музеі рэгулярна наведваем толькі пэўная катэгорыя людзей, а зусім новага гледача акадэмічныя віды мастацтва могуць знайсці менавіта на такіх калабарацыях.

— Мне хацелася б звярнуць увагу і на адукацыйную функцыю мерапрыемстваў падобнага фармату, — дадае Максім Пятруль. — Гэта далучэнне людзей да мастацкага працэсу. Сапраўды, па галерэях і музеях ходзяць нямногія. Гэта не значыць, што нехта добры ці дрэнны, проста людзі занятыя кожны сваім жыццём. А ў гэтага фэшн-мерапрыемства склалася дастаткова шырокая і разнапланавая аўдыторыя... Многія людзі ўпэўнены, што скульптура — гэта толькі помнік. Так, тэма мемарыялізацыі найважнейшых гістарычных падзей вельмі важная, але ёсць таксама іншыя кірункі скульптуры, і яны развіваюцца паралельна. Падобныя мерапрыемствы пераводзяць людзей са стану «джентльменов удачи» («мужык у пінжаку і дрэва») у нармальных грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў Fashion Art Week працягваецца. Хутка ў тэатральных касах пачнецца продаж білетаў на моднае шоу. Застаецца дадаць, што, паводле традыцыі, якая ўжо склалася, кожны раз Fashion Art Week заяўляе для сваіх гледачоў дрэс-код (пра тое, якім ён будзе гэтым разам, каманда арганізатараў аб'явіць крыху пазней). Вядома, і ў самых звычайных джынсах і худзі вас з залы ніхто не выганіць. І ўсё ж, кажа Іван Караткевіч, вельмі хацелася б, каб як мага больш гасцей падтрымалі дрэс-код. Тым больш што атмасфера Купалаўскага тэатра спрыяе смеласці пераўвасабляцца і творча выказваць сваё «Я».

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Фотафакт

Хто стаў пераможцам «Фактар.BY»?

Завяршыўся трэці сезон аднаго з самых папулярных беларускіх музыкальных шоу

За перамогу ў праекце змагаліся тры суперфіналісты: Аляксей БУДЗЬКО з каманды Вольгі Бузавай, Данііл САВЕНЯ з каманды Сярогі і падапечная Руслана Аляхно — Маргарыта ШЫБАЕВА.

Па выніках конкурсу лепшым выканаўцам стаў 19-гадовы Данііл Савеня са Слуцка. Юнак дзевяць гадоў вучыўся ў Маладзечне, у спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку. Сёння ён — навучэнец Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў. Акрамя сёлетняй перамогі ў праекце, у яго скарбонцы ёсць узнагарода пераможцы конкурсу маладых выканаўцаў на Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі «Маладзечна-2023».

Пасля заканчэння шоу Данііл адзначыў:

— Удзельнічаючы ў праекце, мы выконвалі сваю задачу: дарылі гледачу цяпло, натхненне, зарад на светлую будучыню — і гэта, на мой погляд, вельмі важна. Таксама важна ставіць недасягальныя мэты, імкнуцца дасягнуць няскораныя вяршыні. Я буду з цяплом успамінаць «Фактар.by», гэты праект хутчэй не конкурс, спроба сваіх сіл, і кожны з нас, упэўнены, імкнуўся зрабіць усё магчымае...

Яна ВАЛАСАЧ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

КАБ ВОЧЫ ГАРЭЛІ І СПЯВАЛА ДУША

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, да таго моманту, калі паўстала пытанне выбару прафесіі, хлопец яшчэ не ўсвядоміў у сабе такой любові да музыкі, каб задацца мэтай прысвяціць ёй жыццё. Аднак лёс распарадзіўся як трэба — у Беларускім інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі, куды ён паступіў вучыцца на інжынера, таксама быў аркестр рускіх народных інструментаў. Зноў у руках апынулася балалайка «Секунда». Выступалі студэнты не толькі на ўсіх інстытуцкіх канцэртах, але і на гастролях у роднасных ВНУ Прыбалтыкі, Украіны, Расіі. Там жа, у аркестры, ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Аксанай, якая іграла на балалайцы, вучылася ў кансерваторыі ды іншы раз замяняла кіраўніка аркестра.

Мікалай ЯРМАЛЬЧУК.

ЧАМУ Б НЕ Я?

Іграла Аксана на інструменце, выкрабленым вядомым майстрам Родзіным. Паднаўляць яго ездзілі ў Падмаскоўе ўдваіх. Спачатку — з Мінска, потым — з Пінска, куды атрымалі размеркаванне. Руслан — на рамонтна-экскаватарны завод, Аксана — у дзіцячую музычную школу.

— Я ўсё здзіўляўся, чаму ў нас у Беларусі няма майстроў па балалайках і домрах, бо патрэба ў іх была. Асабліва востра паўстала пытанне, калі распаўся Савецкі Саюз — у Падмаскоўе ездзіць стала вельмі нятанна. Адночы падумаў: а можа, гэта якраз маё? І вырашыў паспрабаваць, — распавядае Руслан Алегавіч.

Увогуле, пачаў збіраць адпаведную інфармацыю па бібліятэках, размаўляў з музыкамі. З іх дапамогай склаў пералік майстроў з Масквы, Ленінграда. А яшчэ — у адной з бібліятэк наткнуўся на часопіс «Навука і жыццё» за 1986 год з публікацыяй «Слова пра балалайку» расійскага інжынера-авіяканструктара, майстра спорту СССР, неаднаразовага рэкардсмена свету ў класе мадэляў верталётаў Марка Купфера, гарачым захапленнем якога было аднаўленне спрадвечна рускіх шчыпковых музычных інструментаў.

Праз знаёмых педагогаў пінчук звязаўся з вядомым на ўвесь Савецкі Саюз балалаечнікам Паўлам Нічыпарэнкам, які напісаў уступнае слова да артыкула Купфера, папытаў яго кантактны тэлефон і патэлефанаваў.

Марк Аляксандравіч запрасіў маладога настойлівага беларускага калегу да сябе ў Маскву, падзяліўся досведам, перадаў чарцяжы. Для Макарэвіча гэта і стала пунктам адліку ўласнай руплівасці.

У ТРАДЫЦЫЯХ КРАМОНЫ

Першая балалайка давалася цяжка, іншы раз даводзілася дзейнічаць метадам спроб і памылак. Сумяшчаючы працу над ёй на кухні вечарамі і ў выхадныя з асноўнай прафесіяй, ён рабіў інструмент прыкладна год. Настольнай стала кніга «Выраб і рамонт шчыпковых музычных інструментаў», што аднойчы выпадкова трапіла на вочы. Балалайку, што скончыў у 1993 годзе, Руслан адвёз паказаць майстру, які падзяліўся з ім адмысловым дрэвам для яе вырабу.

— Ён сказаў: для першага разу выдатна. І я зразумеў: «выдатна» і «для першага разу выдатна» — не адно і тое ж. Галоўнае — першы блін не выйшаў камяком. І я зноў накіраваўся па досвед да расійскіх майстроў. Некаторыя сакрэтамі дзяліліся скупа, іншыя ж ахвотна распавядалі, хтосьці нават падарыў адмысловы напільнік, хтосьці — кавалак дрэва, падзяліліся і ладавым дротам. Зрабіў некалькі прылад. А калі набраўся досведу, вярнуўся да чарцяжоў Купфера. У 1998 годзе вырабіў балалайку, з якой вучаніца маёй жонкі на конкурсе імя Жыновіча ў Беларусі заняла першае месца. Поспех юнай выканаўцы расцаніў як прызнанне, што інструмент атрымаўся сапраўды годны. Гэта мадэль з невялікімі ўдасканаленнямі і стала для мяне базавай.

Робіць яе Руслан Алегавіч з двухтысячнага года, спрабуючы розныя матэрыялы. Класічны матэрыял для балалайкі — хвалісты клён, які расце ў гарах, тэкстура якога ў разрэзе пад лакам іграе на святле. Знакамітыя крамонскія майстры рабілі свае скрыпкі менавіта з гэтага дрэва. Гэта ўніверсальны музычны матэрыял. З нашага дрэва балалайку ці домру таксама, вядома, можна вырабіць, кажа пінчук, але гэта будзе прылада сярэдняга класа для навучання дзетак у музычнай школе на пачатковым этапе. А каб дамагчыся якасці гуку, неабходна найлепшая драўніна: для накладак грыфа — чорнае дрэва, для верхніх дэк — чырвоны канадскі кедр.

У свой час у Маскве існавала некалькі фірмаў, якія гандлявалі дрэвам з усяго свету. Гэта было нятанна, але, прынамсі, майстры маглі купіць тое, што неабходна. З увядзеннем эканамічных санкцый замежныя прадпрыемствы з рынку сышлі, і матэрыял сталі шукаць праз інтэрнэт. А крыху больш за год таму па сямейных справах Макарэвічу давялося пабываць у Індыі, і ён наладзіў сувязі з мясцовымі пастаўшчыкамі чорнага, эбенавага дрэва, палісандру. Адпраўляў пасылкі сабе ў Пінск сам, цяпер па перадаплаце дасылаюць індыйскія партнёры. Праўда, узнікла праблема іншага роду: дрэва, перш чым пусціць у вытворчасць, трэба падсушваць — у павольнай сушцы яму трэба вылежвацца гады тры. Вось і напярэдадні Новага года пасылка прыйшла — гэта таксама матэрыял на перспектыву.

«ЗА ТАБОЙ — ШКОЛА»

Спачатку было дзве-тры замовы ў год на выраб балалаек і домраў і прыкладна дзясятак — на рамонт. У трохпакаёвай кватэры адзін з пакояў адвялі пад майстэрню. Нарыхтоўкі на станках майстар рабіў на бацькоўскай дачы ўлетку, а дома выконваў толькі ручную, чысцейшую працу.

— Увесну 2018-га падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з творчай моладдзю ў Мінску была агучана праблема стварэння айчынных інструментаў і іх рамонту. Прэзідэнт паабяцаў разабрацца, адзначыўшы пры гэтым: што можна рабіць у сябе, будзем рабіць. Я глядзеў тую перадачу і ледзь у крэсле тады не падскочыў: гэта ж пра мяне!

Чыноўнікі ад культуры сталі метадычна абследаваць раён за раёнам у пошуках айчынных майстроў-самародкаў. У спісе апынулася і прозвішча Макарэвіча. Яго запрасілі на прэзентацыю. Тая сустрэча стала выратавальнай: «Тады і даў кіраўнік дзяржавы даручэнне знайсці мне памяшканне пад майстэрню без арэнднай платы, адзначыўшы пры гэтым: «За табой — школа, у цябе павінна быць больш памочнікаў».

Сёння ў майстэрні з Русланам працуе Мікалай Ярмальчук, дапамагае яму рабіць балалайкі і домры, а для душы займаецца электрагітарамі. Сам таксама пінчук. У савецкія часы ў Калінінградзе скончыў вышэйшае інжынернае марское вучылішча. 10 гадоў таму вярнуўся на радзіму. Так і сышліся майстры на агульнай творчай глебе.

АДШУКАЦЬ САМАРОДКАЎ...

За год па замовах дзіцячых школ мастацтваў, музычных каледжаў, устаноў культуры яны выкрабляюць каля 25 балалаек і домраў. Працуюць усяго з адным выхадным у тыдзень і практычна без адпачынкаў — рэальны попыт значна вышэйшы: у год 50-60 інструментаў. Ёсць у горадзе пара майстроў, якія робяць гітары, старадаўнія музычныя прылады, але гэта для іх як хобі — людзі занятыя на асноўнай працы і прыцягнуць іх не ўяўляецца магчымым.

Паскорыць працэс можа сучаснае абсталяванне — адмысловы фрэзерны станок, здольны з нарыхтоўкі зрабіць гатовую на 90-95 % дэталь. Пакуль усё гэта робіцца ўручную. Цана пытання прымальная, але праблема ў тым, што плошчаў для іх установіць бракуе. Патрэбны яшчэ адзін пакой, прычым з выцяжкай. Што ж датычыцца зборкі — рукі майстра і душу, якая ўкладваецца ім у кожны інструмент, машына не заменіць.

Пытанне падрыхтоўкі вучняў больш складанае ў разы. Адзін майстар яго не здолее вырашыць — павінны падключыцца зацікаўленыя спецыялісты як сферы адукацыі, так і культуры. Тут чалавеку патрэбныя і сталярныя навыкі, і музычны слых, а галоўнае — каб вочы гарэлі і спявала душа. Такіх самародкаў адшукаць — тая яшчэ задачка.

Майстар лічыць, што справе падрыхтоўкі такіх спецыялістаў маглі б паспрыяць і ўрокі працы ў школе, і заняткі навучальна-вытворчага камбіната, калі старшакласнікі адзін дзень цалкам прысвячаюць асваенню той ці іншай прафесіі. А каб зацікавіць дзяцей музыкай, для пачатку прапанаваць ім у якасці ручной працы, скажам, камплекты для зборкі электрагітар, наборы тыпу «Зрабі сам». Дарэчы, на Захадзе такія канструктары вельмі папулярныя, і людзі атрымліваюць задавальненне нават ад самога працэсу.

Развівацца трэба ў любым выпадку, інакш — тупік, упэўнены Руслан Макарэвіч. Вось і прэмія Прэзідэнта тут вельмі дарэчы.

Ірына АРЛОВА,
фота аўтара.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Местонахождение и земельный участок	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	1. Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-67598 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – зерносклад деревянный, общая площадь – 297,1 кв. м, составные части и принадлежности: 2А1/д – зерносклад деревянный)	Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, 15/1, зерносклад деревянный, район д. Осиповичи	5922,00	592,20	296,10
	2. Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-67599 (назначение – здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции), наименование – весовая, общая площадь – 19,3 кв. м, составные части и принадлежности: 3А1/к-весовая, а-навес)	Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, 15/2, весовая, район д. Осиповичи			
2	Кап. строение с инв. № 631/С-67692 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание мобильное, 33,2 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к-здание мобильное, а-навес)	Кадастровый номер 621350100007002500, площадью 0,0229 га, назначение – для строительства и обслуживания здания мобильного. Право аренды. Ограничения (обременения) прав на зем. участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 Вольт, площадь 0.0001 га. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 103А	360 730,80	36 073,08	18 036,54
	Кап. строение с инв. № 631/С-67691 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад ЖКУ, 737 кв. м, составные части и принадлежности: А1/кп-технологическое здание, А-склад ЖКУ)	Кадастровый номер 621350100007002501, площадью 0,1282 га, назначение – для строительства и обслуживания склада ЖКУ. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109А			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67689 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад удобрений 1 химия, 1989,8 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к-склад удобрений 1 химия, а-навес)	Кадастровый номер 621350100007002498, площадью 0,3076 га, назначение – для строительства и обслуживания склада удобрений 1 химия. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67695 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад фосмуки с приемным устройством и компрессорной, 162 кв. м, составные части и принадлежности: 1/кп-компрессорная, 1А1/к-приемное устройство, а1-навес, а2-навес, А-склад фосмуки с приемным устройством и компрессорной)	Кадастровый номер 621350100007002503, площадью 0,2309 га, назначение – для строительства и обслуживания склада фосмуки с приемным устройством и компрессорной по ул. Шубина в г. Вилейке. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109Б			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67694 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад фосмуки 1 химия, 0 кв. м, составные части и принадлежности: А-склад фосмуки 1 химия)	Кадастровый номер 621350100007002502, площадью 0,0316 га, назначение – для строительства и обслуживания склада фосмуки 1 химия по ул. Шубина в г. Вилейке. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109В			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67693 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад удобрений 1 химия, 2083 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к-склад удобрений 1 химия, Б1/к-пристройка)	Кадастровый номер 621350100007002499, площадью 0,3064 га, назначение – для строительства и обслуживания склада удобрений 1 химия. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 107			
	Автовесы 40 ТН, инв. № 1145	Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 103А			
	Конвейер КТ 18, инв. № 1484	Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109			
	Ресивер, инв. № 6048-ОС; компрессор, инв. № 6049-ОС; шкафы электрощитовые, инв. № 6047-ОС, 5 шт.	Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109Б			

В отношении лота № 1 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 138 (30018) от 20.07.2023, стр. 14, № 197 (30077) от 11.10.2023, стр. 15, № 214 (30094) от 03.11.2023, стр. 15, № 228 (300958) от 24.11.2023, стр. 15, № 245 (300975) от 19.12.2023, стр. 15, № 7 (300991) от 11.01.2024, стр. 14. В отношении лота № 2 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 55 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 180 (30060) от 16.09.2023, стр. 6, № 211 (30091) от 31.10.2023, стр. 6, № 227 (300957) от 23.11.2023, стр. 9, № 245 (300975) от 19.12.2023, стр. 15, № 7 (300991) от 11.01.2024, стр. 14

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621300000001003832, для ведения товарного сельского хозяйства, пл. – 159,4315 га. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) в отношении земельного участка лота № 1: виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2,4, площадь – 83,9400 га; земли, находящиеся на природных территориях, подлежащих специальной охране, код – 2,5, площадь – 14,9300 га; земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 11,7700 га; земли, находящиеся в придорожной полосе автомобильной дороги, код – 7,1, площадь – 18,1200 га; земельные участки, находящиеся на мелиорируемых землях, код – 12, площадь – 71,4000 га. Участок № 53

Ограничения (обременения): Лот № 2 имеет обременение в виде заключенных договоров аренды. Вопросы по обременениям по тел. +375293489225

Дата и время проведения торгов	**12 февраля 2024 года в 14.30 (регистрация – с 14.00 до 14.25)**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 30 января 2024 года до 16.00 8 февраля 2024 года**

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 12.02.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1 – 7 % от конечной цены предмета торгов, по лоту № 2 – 7,5 % от оценочной цены предмета торгов (801 624,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %).**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону **+375299999112, Чеслав. Дополнительная информация по лоту № 2 по тел. +375293082762, Екатерина.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – Частного торгово-производственного унитарного предприятия «Белшинзапчасть» (УНП 191111830, г. Минск, ул. Селицкого, д. 69, оф. 123)

Дата и время проведения торгов: **01 марта 2024 года**. Начало – 10.00.
Заявки принимаются с 30 января 2024 года по 28 февраля 2024 года.
Место проведения торгов: Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **Частное торгово-производственное унитарное предприятие «Белшинзапчасть» (УНП 191111830)**, в лице ликвидатора – директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско А.А.

№ лота	Наименование лота	Начальная цена руб., без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1	Капитальное строение с инв. № 615/С-39498, расположенное по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Ленинская, д. 32Б, площадь – 1299,5 кв. м, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально – технического снабжения, хранилищ, с составными частями и принадлежностями: склад для хранения тары – литера А1/кп, навес – литера 1; наименование – склад для хранения тары (свидетельство (удостоверение) № 615/1606-11106 о государственной регистрации), принадлежит на праве хозяйственного ведения	162 000,00	5 %	1 %
	Сведение о земельном участке: кадастровый номер 625850100001003785, площадь – 0,3383 га, назначение – земельный участок для обслуживания материально-технической базы (свидетельство (удостоверение) № 615/1606-11106 о государственной регистрации), принадлежит на праве постоянного пользования			
	Иные сведения: на дату проведения торгов имеется обременение права собственности правом залога (идентификационные сведения о правообладателе – ОАО «Приорбанк»)			
2	Изолированное помещение с инв. № 500/D-708036841, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Селицкого, 69-123, площадь 174,1 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение № 123 (свидетельство (удостоверение) № 500/938-4797 о государственной регистрации), принадлежит на праве хозяйственного ведения	296 000,00	5 %	1 %
	Иные сведения: на дату проведения торгов имеется обременение права собственности правом залога (идентификационные сведения о правообладателе – ОАО «Приорбанк»)			

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 15.00 26 февраля 2024 года перечислить задаток по выбранному лоту в соответствии с заключенным с организатором торгов договором о задатке на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 28 февраля 2024 года заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (ред. от 12.07.2013), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Формы документов необходимо предварительно запросить у Организатора аукциона. Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406; время с 9.00 до 16.00 в рабочие дни. Направление документов почтовым отправлением с целью регистрации в качестве участника аукциона не допускается.

Телефон для ознакомления и осмотра лота: +375296847176, Яскевич Дмитрий Васильевич, в рабочие дни с 9.00 до 16.00;

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три рабочих дня до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником или для участия в торгах явился только один участник;
- для участия в торгах не было подано ни одного заявления или ни один из участников не явился.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов, единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов, единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в день проведения торгов обязан подписать протокол о результатах торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов, единственным участником несостоявшихся торгов, выразившим согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 20 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен ликвидационной комиссией (ликвидатором).

Да Жукава ў нагрузку...

Кніга мемуараў легендарнага савецкага военачальніка, Маршала Савецкага Саюза, адзінага чатырохкратнага Героя Савецкага Саюза (Генсека ЦК КПСС Леаніда Ільіча Брэжнева ў разлік не бяром. Свае чатыры медалі Героя «Залатая Зорка» ён атрымаў у 1966, 1976, 1978, 1981 гадах, калі вайна даўно завяршылася і ён быў фактычным кіраўніком СССР, а не толькі КПСС) «Успаміны і развагі», упершыню выдадзеная ў 1969 годзе, стала падзеяй і для чытачоў, і для кніжнага гандлю, і для бібліятэк. Жукаўскія мемуары, першы тыраж якіх у 100 000 экзэмпляраў разышоўся імгненна, ужо ў тым самым годзе былі перавыдадзены накладам у 400 000 экзэмпляраў. Пасля кніга пры жыцці «Маршала Перамогі» выйшла яшчэ ў 1971 і 1972 гадах. Не спынілася выданне мемуараў асобы, з якой найперш у масавай свядомасці савецкага чалавека атаясамлівалася перамога ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў, і ў наступныя гады, пасля смерці Георгія Канстанцінавіча (пайшоў з жыцця Жукаў 18 чэрвеня 1974 года)...

Чым прыцягвалі тэксты ўспамінаўваеначальніка, які сваім ваенным лёсам прычыніўся літаральна да ўсіх галоўных падзей Вялікай Айчыннай?.. Пра вайну, самога Сталіна, дзейнасць Стаўкі Вярхоўнага, пра падзеі крытычнага характару, якім ён быў непасрэдным сведкам, у якіх напрамую ў большасці выпадкаў удзельнічаў: акрамя сваіх пасад ў якасці начальніка Генеральнага штаба РСЧА (чэрвень—ліпень 1941-га), члена Стаўкі Галоўнага камандавання (з 23 чэрвеня 1941 года), Стаўкі Вярхоўнага камандавання (з 10 ліпеня 1941 года), Стаўкі Вярхоўнага Галоўнага камандавання (з 8 жніўня 1941 года), а з 26 жніўня — намесніка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, з 27 жніўня 1942 года — першага намесніка Народнага камісара абароны СССР, Жукаў яшчэ і франтамі камандаваў: Рэзервовым, Ленінградскім, Заходнім (адначасова быў галоўнакамандуючым Заходняга напрамку), 1-м Украінскім і 1-м Беларускім...

Пройдуць дзесяцігоддзі. І ўжо ў новым стагоддзі «Успаміны і развагі» Г. К. Жукава калі і будуць выходзіць, то накладам усяго ў некалькі тысяч экзэмпляраў. І не так часта, як раней. Нават пры ўмове, што ў тэксце акажуцца вернутымі каля 300 цэнзарскіх правак і вынятак з арыгінальнага тэксту ўспамінаў легендарнага военачальніка, чалавека, без якога нельга ўявіць гісторыю не толькі Вялікай Айчыннай вайны, але і ўвогуле Савецкага Саюза.

Гісторыя Вялікай Айчыннай не можа прачытвацца, разглядацца без біяграфіі «Маршала Перамогі»... Жукаў камандаваў савецкімі войскамі ў такіх знакавых наступальных аперацыях, як Маскоўскае контрнаступленне (да 7 студзеня 1942 года), Ржэўска-Вяземская аперацыя (8 студзеня — 20 красавіка 1942 года), Першая Ржэўска-Сычоўская аперацыя (30 ліпеня — 23 жніўня 1942 года), Другая Ржэўска-Сычоўская аперацыя (25 лістапада — 20 снежня 1942 года)... Маршал 8 мая 1945 года ў 22.43 (9 мая ў 00.43 па маскоўскім часе) у Карлсхорце (Берлін) прыняў ад генерал-фельдмаршала Вільгельма Кейтэля капітуляцыю войскаў нацысцкай Германіі. 24 чэрвеня 1945 года ў Маскве на Чырвонай Плошчы Маршал Савецкага Саюза Георгій Жукаў прымаў Парад Перамогі...

Напрыканцы 1960-х — у пачатку 1970-х заставаліся жывымі ўдзельнікі і сведкі Вялікай Айчыннай... І для тых, хто нарадзіўся пасля 1945 года, вайна заставалася важнай тэмай. Таму, зразумела, і цікавасць

Тое самае выданне 1971 года, якое прадавалася з «нагрузкай».

да падзей 1941—1945 гадоў была надзвычайнай. Прачытаць пра іх у выкладанні чалавека, які меў высокі аўтарытэт і, дарэчы, не вельмі часта з'яўляўся на экранах тэлебачання, не вельмі часта выступаў у перыядычным друку, а гадамі — і ўвогуле не з'яўляўся і не выступаў, было надзвычай важна.

І пры тым, што папяровая, друкаваная кніга ўвогуле карысталася ў 1960—1970-я гады выключным попытам. Гэта пры тым, што людзей мала задавальнялі грамадскія бібліятэкі, мільёны чалавек імкнуліся мець уласныя хатнія кнігазборы. Тыражы многіх выданняў, у тым ліку і «Успамінаў і развag» Георгія Жукава не маглі напоўніцу задавольніць грамадзян. Узнікалі розныя складанасці ў продажы кніг у кнігарнях, а таксама ў набыцці іх бібліятэкамі вялікай краіны. Дарэчы, захавалася такая лічба ў статыстыцы як быццам далёкіх учарашніх дзён: да 60-х гадоў мінулага стагоддзя ў СССР налічвалася амаль 400 тысяч дзеючых бібліятэк. Калі верыць такой статыстыцы, то можна ўявіць, як цяжка было размеркаваць кнігу Георгія Жукава хаця б толькі па бібліятэках. Несумненна, «Успаміны і развагі» чакалі нават у самай далёкай вясковай глыбінцы. Улічыце пры гэтым, што ў СССР працавала Усесаюзнае аб'яднанне «Міжнародная кніга» — арганізацыя, якая займалася экспартна-імпартнымі гандлёвымі аперацыямі з кнігамі, перыёдыкай, аўдыя- і відэапрадукцыяй. «Міжнародная кніга», імкнучыся зарабляць замежную валюту для дзяржаўнага бюджэту, вывозіла ў замежжа вялікія тыражы найбольш папулярных кніг на рускай мове. Такі істотны попыт, паверце, існаваў. І не толькі ў краінах сацыялістычнага лагера... Што ўжо казаць пра айчынны, савецкі кніжны гандаль!.. Дарэчы, кніга Жукава, якая народжана ў многім дзякуючы ініцыятыве маскоўскага Агенцтва навін і друку, дзе яна і выйшла ўпершыню і выйшлі наступныя шматтыражныя выданні, ужо ў самыя першыя гады пасля з'яўлення пабачыла свет у 30 краінах свету ў перакладзе на 18 моў...

6 верасня 1971 года першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі Пётр Міронавіч Машэраў атрымлівае неспадзяваны ліст ад Георгія Канстанцінавіча Жукава. Цытуем яго на мове арыгінала:

«...Уважаемый Петр Миронович! Неоднократно из разных мест я получаю письма о спекулятивной торговле моей книгой «Воспоминания и размышления». Среди многих писем есть и такие письма, в которых указывают о том, что мою книгу продают с нагрузкой неходовых книг. Такая практика имеет место и в г. Минске, о чем указано в газете, вырезку из которой высылаю Вам.

Прошу Вас дать указание о прекращении подобной практики. Приложение: вырезка из газеты «Подарок... в нагрузку».

Г. Жуков.

4 сентября 1971 г.»

Машэраў накладвае рэзалюцыю сакратару ЦК КПБ па ідэалогіі А. Т. Кузьміну — з патрабаваннем навесці ў «гэтай справе» патрэбны парадак. Што ж за публікацыя патрапіла на вочы Маршалу Перамогі?.. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захавалася і гэтая нататка, дасланая Георгіем Канстанцінавічам, — сціплая карэспандэнцыя з апошняй старонкі «Советской Белоруссии», змешчаная ўжо перад самым рэдактарскім подпісам. «Подарок ... в нагрузку» — назва публікацыі М. Шраера. Аўтар звяртае ўвагу на факт, які яму стаў вядомым на прыкладзе кнігарні № 10 падпісных выданняў горада Мінска. Згадваецца і імя загадчыцы. *«...Проявляя торгашеские тенденции, продавцы предлагали в принудительном порядке вместе с «Воспоминаниями и размышлениями» Г. К. Жукова путеводитель на английском языке «От Бреста до Москвы» стоимостью свыше рубля. Книга В. Бережкова «Тегеран» «шла в паре» с «Евангелием от Робеспьера». Когда тт. Рахкин, Горбачевская купили так называемый «Подарок» и попросили заменить путеводитель какой-нибудь другой книгой на русском языке, старший продавец <...> забрала покупку и вернула деньги.*

29 июня работники Центрального книжного магазина управления книжной торговли продавали литературу на улице. «Воспоминания и размышления» Г. К. Жукова предлагали тоже только вместе с путеводителем на английском языке.

В киоске № 15 от магазина № 11 Миноблкниготорга также продавали книгу маршала Г. К. Жукова с уже упомянутым путеводителем.

Напрыканцы 1960-х — у пачатку 1970-х заставаліся жывымі ўдзельнікі і сведкі Вялікай Айчыннай... І для тых, хто нарадзіўся пасля 1945 года, вайна заставалася важнай тэмай. Таму, зразумела, і цікавасць да падзей 1941—1945 гадоў была надзвычайнай. Прачытаць пра іх у выкладанні чалавека, які меў высокі аўтарытэт і, дарэчы, не вельмі часта з'яўляўся на экранах тэлебачання, не вельмі часта выступаў у перыядычным друку, а гадамі — і ўвогуле не з'яўляўся і не выступаў, было надзвычай важна.

Узнав о нарушениях правил советской торговли, республиканское управление госторгоинспекции и управление госторгоинспекции города Минска предложили раскомплектовать так называемые подарки. Однако работники книжной торговли ушли от этого.

Вместо принудительного сбыта литературы надо организовать культурную торговлю книгами и обеспечить уважительное отношение к покупателям».

Факты, выкладзеныя ў газетным выступленні, відавочна, разглядаліся ў Дзяржкамдруку рэспублікі і да звароту Георгія Канстанцінавіча Жукава ў вышэйшую партыйную інстанцыю Беларусі. Бо 29 чэрвеня 1971 года старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Г. Канавалаў выдаў загад пад нумарам 158 з назвай «Аб фактах парушэння правіл гандлю ў Мінскім аблкнігагандлі»... Чытаем у загадзе «кніжнага міністра»: *«...Выяўлены факты, калі работнікі асобных кнігарняў г. Мінска парушаюць правілы савецкага гандлю. Гэта парушэнне выяўляецца ў продажы выданняў павышанага попыту «з нагрузкай», што выклікае законныя прэтэнзіі пакупнікоў. Так, напрыклад, кніга Г. Жукава «Успаміны і развагі» прадаецца з пуцевадзіцелем «Брэст-Масква» на англійскай мове і г. д.*

Загадваю:

1. Упраўленню кніжнага гандлю (т. Леўшуноў Я. П.), аблкнігагандлям катэгарычна забараніць работнікам кніжнага гандлю продаж літаратуры «з нагрузкай» пад якой бы там ні было нагодай і прыняць неабходныя меры па недапушчэнні падобных фактаў надалей.

2. Указаць дырэктару Мінскага аблкнігагандлю т. Дашкевічу на слабы кантроль з боку аблкнігагандлю за выкананнем парадку і правіл гандлю літаратурай у кнігарнях.

3. Загад давесці да ведама ўсіх работнікаў кнігагандлёвай сеткі рэспублікі...»

Праўда, у дакладной запісцы намесніку загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП Беларусі С. Я. Паўлаву «кніжны міністр» выклаў сітуацыю больш падрабязна. І пісалася запіска ўжо пасля звароту Георгія Канстанцінавіча Жукава. Ужо адпаведна і розгалас «справы» зусім іншы... Дык вось... Чытаем у запісцы: *«У чэрвені г. г. прадстаўнік АДН прапанаваў Мінскаму аблкнігагандлю для рэалізацыі 10 тыс. экзэмпляраў кнігі Маршала Савецкага Саюза Г. К. Жукава «Успаміны і развагі» з умовай, калі дадаткова да гэтай кнігі будуць прыняты для рэалізацыі 25 тыс. экз. пуцевадзіцеля «Брэст — Масква» на англійскай мове і 400 экз. атласа Кубы коштам па 14 руб. за экзэмпляр...»* Лічбы сур'ёзныя. На 14 рублёў можна было ў той час купіць каля 100 боханаў чорнага хлеба (кошт аднаго складаў у рамках 14—16 капеек). Пенсіі некаторыя ўчарашнія калгаснікі атрымлівалі ў рамках 12—14 рублёў. За месяц. Праўда, ім, пэўна, было не да набыцця «Успамінаў і развag» нават самога Жукава. Яны яшчэ і на свае вочы бачылі вайну, з уласных хат, уласных зямлянак, з акопаў... Чытаем далей у запісцы: *«Кіраўніцтва Мінскага аблкнігагандлю, прыняўшы гэту прапанову, дазволіла дырэктарам некаторых крам прадаваць кнігу Г. К. Жукава з дадаткам падарожніка «Брэст — Масква» і другіх выданняў. Як толькі Дзяржкамітэту па друку БССР сталі вядомыя факты продажу кнігі Жукава Г. К. «з нагрузкай», па гэтым пытанні 29 чэрвеня быў выдадзены загад, які катэгарычна забараняў падобную форму гандлю...*

Газета «Советская Белоруссия», папярэдне не высветліўшы пытання аб прынятых Дзяржкамітэтам па друку БССР мерах, 6 жніўня г. г. надрукавала заметку т. Шраера «Падарунак... «у нагрузку».

Рэдакцыі «Советской Белоруссии» ў сувязі з публікацыяй заметкі Дзяржкамітэтам па друку было дадзена адпаведнае тлумачэнне».

Канфлікт, здаецца, вычарпаны. І газета, маўляў, паспяшалася, і ўсё ўжо ведалі яшчэ да ліста «Маршала Перамогі»... Вось толькі пра Агенцтва друку і навін нічога болей не напісалі, не сказалі... Паступілі, пэўна, па прынцыпе: «... навошта чапаць пастаўшчыка дэфіцытнай літаратуры...» Напарадзе — новыя запатрабаваныя кнігі. Напарадзе — новыя выданні жукаўскіх мемуараў, якія могуць патрапіць і ў іншыя рэгіёны, іншыя рэспублікі бязмежнай савецкай прасторы... Навошта псаваць адносіны?! Ды і выдавецтва такога маштабу — гэта ўжо клопат іншага ЦК, клопат Цэнтральнага Камітэта КПСС, маскоўскага, словам, кіраўніцтва.

Але ж Жукаву трэба адказваць. І ў выніку нараджаецца наступны ліст: «Чатыры разы Герою Савецкага Саюза, Маршалу Савецкага Саюза таварышу Жукаву Г. К.

Паважаны Георгій Канстанцінавіч!

На жаль, прыкры факт продажу Вашай кнігі з дадаткам (так званай нагрузкай) меў месца ў г. Мінску. Па ўказанні ЦК КПБ Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку строга перапыніў падобную практыку рэалізацыі літаратуры, прыцягнуў да адказнасці вінаватых у парушэнні правіл савецкага гандлю...» Спярша на зацвярджэнне Пятру Міронавічу панеслі ліст за яго подпісам: «П. Машэраў, першы сакратар ЦК КП Беларусі». Партыйны кіраўнік рэспублікі выкрасліў сваё прозвішча і слова «першы» і дадаў уласнаручна: «З павагай і найлепшымі пажаданнямі А. Кузьмін».

Такая гісторыя жукаўскага звароту ў беларускі ЦК. Гісторыя, на першы погляд, не дужа значная, а вось у справе фарміравання грамадскай думкі месца ў яе асабліваe...

Кастусь ЛЕШНІЦА,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.

Дзеля памяці

ДЗВЕ СПРАВЫ ЖЫЦЦЯ ГЕНРЫХА ТРАЦЦЯКА

Ён стаў Героем Сацыялістычнай Працы за дасягненні ў сельскай гаспадарцы, а пасля выхаду на пенсію адрадзіў гістарычную сядзібу

Калі сыходзіць нехта з гэтых людзей, звычайна гавораць: сыходзіць эпоха. Сапраўды, яны — знакамітыя, моцныя, таленавітыя аграрыі былі лепшым увасабленнем той эпохі, бо ў многім апярэджвалі час. На Брэстчыне можна згадаць Уладзіміра Бядулю, Уладзіміра Ралько, Абрама Мацкоўскага, Яўгена Кудзінава, Леаніда Лявонава ды іншых... Генрых Траццяк, відаць, апошні з гэтай кагорты, чыя гаспадарка некалі грымела дасягненнямі ва ўсёй былой вялікай краіне.

Дзевяць дзён таму Герой Сацыялістычнай Працы Генрых Траццяк сышоў у іншы свет. І пакінуў пра сябе не толькі добрую памяць, але і канкрэтнае яе ўвасабленне. Аўтару гэтых радкоў давялося пазнаёміцца з Генрыхам Міхайлавічам восем гадоў таму, калі ён ужо амаль два дзесяцігоддзі быў пенсіянерам, але з энергіяй, якой варта пазайздросціць маладым, адраджаў сваё любімае дзецішча — былую панскую сядзібу ў Флер'янове. Паступова яна стала месцам сустрэч творчых людзей, пляцоўкай для правядзення розных культурных мерапрыемстваў.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСА

Мы з ім доўга гаварылі тады, ён ахвотна расказваў пра сябе. Думаю, варта згадаць некаторыя факты яго біяграфіі. Генрых Траццяк у Флер'янове быў не чужым. Ён нарадзіўся і вырас у тутэйшых мясцінах. А ў 1969 годзе вярнуўся сюды пасля заканчэння Беларускай сельгасакадэміі дыпламаваным аграномам. ВНУ, дарэчы, скончыў з адзнакай, выпускніка запрашалі застацца ў аспірантуры. Але ён вырашыў, што тэорыя без практыкі нежывая, таму папрасіўся ў калгас. Кандыдацкую дысертацыю малады аграном абароніць потым, намнога пазней. А пакуль Генрых заняў пасаду агранома ў гаспадарцы, якая мела ўраджайнасць дзевяць цэнтнераў збожжа. Праз год там сабралі ўжо 18 цэнтнераў з кожнага гектара. А яго на агульным сходзе калгаснікаў абралі старшынёй. 28 гадоў Генрых Міхайлавіч кіраваў калгасам. І гаспадарка яго была адной з лепшых не толькі ў рэспубліцы, але ва ўсёй вялікай краіне. Згадзіцеся, у 1987 годзе яшчэ мала хто мог пахваліцца ўраджайнасцю ў 62 цэнтнеры. А ў калгасе імя Ламаносава атрымлівалі роўна столькі. Таму ўзнагароджанне старшыні ордэнам Леніна і Зоркай Героя Сацыялістычнай Працы стала лагічнай адзнакай поспехаў яго прадпрыемства. Варта заўважыць, што ў гарбачоўскую эпоху званні герояў давалі значна радзей, чым у папярэднюю. Таму прысваенне высокага звання Генрыху Траццяку ў 1988 годзе можна лічыць сведчаннем асабліва выбітных поспехаў калгаса імя Ламаносава. Адным словам, гаспадарка грымела амаль на ўвесь Саюз. А праўленне калгаса знаходзілася ў былой панскай сядзібе, на гісторыю якой тады асаблівай увагі ніхто не звяртаў.

У 1990-я гады ўсё пачало хутка мяняцца. І як толькі споўнілася 60 гадоў, Генрых Траццяк пайшоў на пенсію. Новы кіраўнік палічыў былое памяшканне праўлення занадта старамодным і ўсталяваў офіс сваёй гаспадаркі ў суседнім двухпавярховым будынку. А былы фальварак Бохвіцаў як усялякае пакінутае жытло пачаў пакрысе прыходзіць у заняпад. На шчасце, дом самога Траццяка знаходзіцца зусім побач з названай сядзібай. І Генрых Міхайлавіч проста прыглядваў за будынкам, інакш яго разрабавалі б і разнеслі, як не адноўчы здаралася з нічыйнымі пабудовамі. А так дом паволі і зарастаў, і сам сабой ціха разбураўся.

ДОМ З ГІСТОРЫЯЙ

Герой Сацыялістычнай Працы тым часам не сядзеў, склаўшы рукі, на пенсіі, актыўна займаўся грамадскай работай і ў сваёй вёсцы, і ў раёне. Але думка пра тое, як захаваць жыццё старой сядзібы Бохвіцаў, заўсёды прысутнічала, можа, нават на ўзроўні падсвядомасці. Генрых Міхайлавіч зацікавіўся гісторыяй «флер'яноўскага кута» і адкрыў для сябе столькі цікавага! Яшчэ напачатку XX стагоддзя фальварак набыў вядомасць дзякуючы творам і пісьмам Элізы Ажэшкі. Пісьменніца гасцявала і папраўляла сваё здароўе ў Флер'янове, і так пасябравала з яго гаспадарамі, што прысвяціла ім сваю самую лірычную кнігу «Збор лістоў» ды шмат іншых невялікіх твораў, у тым ліку эпісталярнага жанру. Ёсць версія і пра рамантычнае каханне славутай пісьменніцы да гаспадара сядзібы Тадэвуша Бохвіца. Адзін з даследчыкаў творчасці назваў флер'яноўскія канікулы Ажэшкі яе апошняй прыгодай. Праведзенае пісьменніцай лета ў гэтым фальварку стала апошнім у яе жыцці. Але застаўся дуб, пасаджаны рукой пісьменніцы ў 1909 годзе побач з домам, пра гэта нагадвае мемарыяльная таблічка, якая ўстаноўлена даволі даўно...

Потым чаго толькі не пабачыла старадаўняя сядзіба. У Першую сусветную немцы вывезлі кованую браму, якая служыла ўпрыгажэннем фальварка. У Другую сусветную, падчас акупацыі, паводле ўспамінаў старых людзей, тут дыслацыравалася нямецкая жаночая дыверсійная школа. Потым размяшчалася кантора МТС (машынна-трактарная станцыя. — **Аўт.**), апошнім гаспадаром, як ужо гаварылася, быў калгас.

Двухпавярховы драўляны дом быў узведзены Бохвіцамі недзе ў 1870—1875 гадах. Пазней да яго дабавілі парадную прыбудову з чырвонай цэглы, якая, на першы погляд, стварае рэзкі кантраст. Але вельмі хутка да яе прывыкаеш, яна нечым нагадвае паменшаную копію замкавых сцен з вежамі і выглядае даволі прыгожа. Асабліва здалёк. А зблізку — відно, што дзе-нідзе сцяна адрамантаваная.

ГАЛОЎНАЯ ЎЗНАГАРОДА

Калі пачалі шмат гаварыць пра рэстаўрацыю гістарычных аб'ектаў ды і нямала рабіць на гэтым шляху, Генрых Траццяк зацікавіўся перспектывай куплі гэтага аб'екта за адну базавую велічыню. І звярнуўся з адпаведнай заявай да сходу сельгаспрадпрыемства, таму што будынак быў на балансе СВК. Заяву напісаў, а жонцы Ларысе Паўлаўне пакуль рашыў не казаць. Не ведаў, як яна ўспрыме. Яны выгадавалі траіх сыноў. На той час старэйшыя ўнукі былі студэнтамі. Бацькі іх жылі на зарплату, свайго бізнесу не мелі. І як усе дзяды з бабулямі, Траццякі ім, бывала, дапамагалі. Узяцца ж за такі аб'ект азначала пастаянна выдаткоўваць грошы. Думаў, што называецца, і днём, і ноччу, а жонцы да часу пра планы не казаў. Калі ж сход прыняў рашэнне, гэта значыць яго былыя калгаснікі прагаласавалі, каб старую сядзібу аддаць, прыйшоў дадому і з парога аб'явіў. Па дарозе абдумваў розныя варыянты, чакаў яе слоў як прысуду... А яна паглядзела з разуменнем і вымавіла нешта накшталт:

— Ну, вядома. Правільна зрабіў. Цяпер будзем разам займацца.

І гэта была радасць у яго жыцці, не меншая, а можа, і больш значная, чым ранейшыя ўзнагароды. Потым разважыў: хіба магло ў іх з Ларысай быць інакш? Некалі яе, карэнную ленінградку, прывёз у вёску. Не адмовілася жыць тут, не настаяла на аспірантуры і перспектыве застацца хоць бы ў Горках. Шмат гадоў таму раздзяліла з ім усе цяжкасці старшынёўства. На пачатку іх жыцця ў вёсцы яна, маці малых дзяцей, хадзіла за сем кіламетраў на работу ў школу, бо бліжэй школы не было, і не патрабавала для сябе службовую машыну. Так што, усвядоміў яшчэ раз без малога 80-гадовы чалавек, Ларыса Паўлаўна — яго самая надзейная апора. І гэта таксама надало сілы ў новых клопатах.

А іх навалілася многа. Дакументы былі зроблены ў 2012 годзе, заплачана славутая адна базавая і яшчэ 500 долараў у эквіваленце за афармленне папер. З таго часу былая сядзіба Бохвіцаў стала прыватнай уласнасцю Генрыха Траццяка. Па дамоўленасці з жонкай ён траціў палову пенсіі кожны месяц на будаўнічыя матэрыялы і аплату працы наёмнага рабочага. Але гэтага, вядома, не хапала. Даводзілася нешта «пазычаць» з асабістых зберажэнняў, вышукваць іншыя магчымасці. З фізічнай часткай работы дапамагалі сябры, родныя, блізкія.

«Я РАТУЮ ЯЕ, А ЯНА МЯНЕ»

...Помню, як Генрых Міхайлавіч адчыніў веснічкі і запрасіў зайсці. І тут жа са смехам згадаў: «Калі ў 2012 годзе мне прадалі гэты дом, умоўна кажучы, за базавую велічыню, адзін карэспандэнт напісаў, што гады праз тры тут будзе двухметровая агароджа і аўчарка пры весніцах. Бачыце, няма ні плота ў рост чалавека, ні сабак злых, кожны можа зайсці сюды». І расказваў далей:

— За гэты час паступова ўдалося прыбраць кустоўе і бур'ян, уставіць вокны, дзе іх не было, паправіць дах, замазаць дзіркі ў столі, памяняць гнілыя дошкі ў падлозе, зрабіць шмат іншага. Пасля ачысткі запрацаваў камін, якому больш за сто гадоў. Прыведзена ў парадак яшчэ адна печка, якая добра абагравае памяшканне. Сцены ў пярэдніх залах ачышчаны і атынкаваны, выглядаюць зараз не запушчанымі, а цалкам прыстойнымі.

— Мы гэта зрабілі прымітыўным спосабам, — працягваў Генрых Міхайлавіч, — падраўнялі сцены самі, як змаглі. Калі рабіць сапраўдны рамонт, трэба наймаць спецыялістаў, пакуль на гэта сродкаў няма. Чыста, з даху не цячэ, можна людзям зайсці, вось з мяне і даволі.

А гэта яшчэ адзін фрагмент з той нашай гутаркі:

— Некаторыя мне гавораць: чаму табе не сядзіцца на пенсіі з вудай на беразе альбо з кніжкай на канапе? Каб адрадзіць гэтую сядзібу па-сапраўднаму, трэба многія сотні тысяч долараў. А што твая пенсія, памножаная на энтузіязм? А я ім адказваю, што не стаўлю задачу адрадзіць фальварак у першапачатковым выглядзе. Я стаўлю задачу: не даць загінуць. Пакуль і гэтага хопіць. Я яе ратую, а яна мяне.

Яшчэ ён расказваў, як тры гады таму баяўся падняцца на некалькі жэрдак па драбінах, каб сарваць яблыкі з дрэва. Спіна балела, ногі трымцелі. А цяпер сам на страсе чарапіцу папраўляе: «Нібы другое дыханне паявілася. Не ведаю, як гэта назваць. Відавочна, што мы вельмі мала знаем як пра свой арганізм, так і пра пабудову сусвету ў цэлым», — заключыў 80-гадовы чалавек.

— Як вядома, лепшы адпачынак — гэта перамена дзейнасці. Яшчэ разумныя людзі кажуць: калі ты лёг на канапу, ты пачаў паміраць. Жывы чалавек — пакуль рухаецца, пакуль робіць нешта патрэбнае. Вось пасадзіла Элізаа Ажэшка дуб, яе самой ужо сто гадоў няма, а дуб расце. Мы ўсе яе ўспамінаем, таблічку прымацавалі.

АД ВЯЧОРАК КАЛЯ КАМІНА ДА «ФЛЕР'ЯНОЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ»

Летам 2015 года ў былой сядзібе Бохвіцаў прайшло раённае свята фальклорнага мастацтва «З крыніц спрадвечных». Сабралася з дзясятак фальклорных калектываў, паказвалі сваё мастацтва. Былі і рамеснікі, народныя майстры. Свята, адным словам, удалося. А яшчэ летам у былы панскі дом сталі прыходзіць вясковыя дзеці. Ларыса Паўлаўна арганізоўвала нешта накшталт гуртка паэзіі і музыкі. Школьнікі, у тым ліку тыя, што гасцявалі ў бабуль на канікулах, бралі з сабой музычныя інструменты, іншыя спявалі альбо дэкламавалі вершы. Дзеці хутка палюбілі гэтыя вячоркі каля каміна. Меншыя атрымлівалі салодкія прызы, большыя — магчымасць выступіць на публіцы. І ў гэтым угадваецца пэўная пераемнасць традыцый. Элізаа Ажэшка пакінула ўспаміны, як пасля абеду штодзень на верандзе ладзіліся чытанні і літаратурныя дыскусіі.

...Генрых Міхайлавіч, сапраўды, укладваў у гэтую справу ўсю душу, здолеў прыцягнуць грамадскасць, прадстаўнікоў працоўных калектываў, аб'яднаў вакол сябе сотні людзей. І цяпер сядзіба служыць людзям. З 2017 года тут праходзяць «Флер'яноўскія чытанні», на якіх збіраюцца літаратары, навукоўцы, дзеячы мастацтва, прызнаюцца знакамітыя выхадцы з Ляхаўшчыны.

У афіцыйным некралогу Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, абласнога Савета дэпутатаў, абласнога Савета ветэранаў гаворыцца, што жыццё Генрыха Траццяка з'яўляецца яркім прыкладам адданасці сваёй краіне, узорам сумленнасці, прыстойнасці і высокага прафесіяналізму. Лепей, відаць, і не скажаш. А лепшым помнікам патрыёту сваёй Айчыны будзе далейшае жыццё гістарычнай сядзібы, адраджэнню якой ён прысвяціў ладны кавалак жыцця.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва аўтара.

Этнаскарбонка

КАВАЛЕР З АДКІДНЫМ КАЎНЕРЫКАМ

Таямніцы народнага мужчынскага строю

Так сталася, што даследчыкі больш увагі звяртаюць на вывучэнне жаночага строю. Яно і не дзіва: такая вопратка лепш аздаблялася, а па розных дэталях на жаночым адзенні прасцей было вызначаць рэгіянальныя асаблівасці. Пра тое ж, як выглядалі мужчыны, менш гаварылася і пісалася. Хаця ў розных музеях сабрана багата экспанатаў і здымкаў, якія дазволяць даведацца прыхільнасці моцнага полу ў адзенні, статус яго гаспадароў і нават прасачыць, як паступова пад уплывам гарадской культуры мяняўся выгляд вясковых жыхароў. Каб крыху выправіць гэту сітуацыю, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ў межах праекта «Простыя словы» арганізаваў сустрэчу з гісторыкам, даследчыкам традыцыйнай беларускай культуры, навуковым супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту Аляксеем ДРУПАВЫМ.

ГАЛІФЭ, МАНІШКА, ВЕРХАПЛУТЫ

Абавязковымі элементамі ў мужчынскім строі дзесяць гадоў таму былі кашуля, пояс і нагавіцы. Апошнія, як правіла, былі льнянымі, насіліся ўвесь сезон, зімой паверх іх маглі апранацца суконнікі з тканага ці валянага сукна. Нагавіцы простага крою праіснавалі да 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя. А далей прыйшла мода на галіфэ. Хтось насіў такія штаны, у якіх вярнуўся з войска, іншым падобную рэч шылі жонкі з хатняга сукна. Менавіта мода на галіфэ паўплывала на кашулю: яна становіцца карацейшай, каб не прыкрываць такі любімы хлопцамі элемент вопраткі. Уласна, па даўжыні кашулі можна вызначаць час яе стварэння: чым яна даўжэйшая, тым раней, верагодна, была пашыта. Любоў да галіфэ пратрымалася да сярэдзіны XX стагоддзя. А калі яна сышла, то і традыцыйны строй пачаў адыходзіць. Людзі сталі насіць «крамное» — такія рэчы ў той час лічыліся больш «статуснымі» за пашытыя дома.

Канешне, у нашых дзядоў было святочнае і паўсядзённае адзенне. Крой кашулі ў залежнасці ад рэгіёна мог мяняцца. Недзе — з адкладным каўняром, ці «стоечкай», або наогул без яго. Рабочыя кашулі шыліся звычайна з неадбеленага, больш грубага льнянога палатна. Каб яно не націралася шыю, каўнерчык вакол шыі маглі падшываць больш тонкай тканінай, часам набытай у краме.

А ўжо як аздабляць мужніну вопратку, жанчыны вырашалі самі. Калі бачылі, што ў суседак мужыкі ходзяць без вышытага падола, то маглі і не траціць час на яго аздабленне. Тое ж самае і з рукавамі. А вось ужо манішку (планку, прышытую на грудзях) ды каўняры ўсё ж стараліся вышыць.

Праўда, у розных рэгіёнах Беларусі можна сустрэць і кашулі з вышытымі падоламі, напрыклад, такія былі на заходнім Палессі, у Ганцавіцкім раёне, але гэта не столькі рэгіянальная асаблівасць, колькі жаданне майстрых паказаць, як яны кахаюць і паважаюць сваіх мужыкоў, альбо заявіць пра свае ўменні і густ.

Часам, калі кашуля зношвалася, гаспадыні манішкі адпорвалі і перашывалі на новае адзенне. Так, некаторыя вышытыя планкі маглі «змяніць» каля пяці кашуль.

Як заўважыў Аляксей Друпаў, па мужчынскім строі не так проста вызначыць, у якім раёне той быў зроблены. Нават узоры і тэхнікі вышыўкі не асабліва дапамогуць. Хіба што калі гэта ўжо занадта рэдкія элементы. Так, у некаторых вёсках Кобрынскага раёна кашулі аздабляліся чорнай вышыўкай. Верхаплуты (асаблівая тэхніка вышыўкі) на каўнерыках былі характэрны для поўдня. Даволі буйныя чорныя і чырвоныя васьміканцовыя зоркі — адна з рыс Калінкавіцкага строю. Калі ў арнаменце пароўну пададзена чорнага і чырвонага колеру, гэта характэрная асаблівасць Дамачаўскага строю. Але ў адным і тым жа рэгіёне даследчыкам могуць трапляцца рэчы з вышыўкамі, выкананымі ў розных тэхніках і з непадобнымі ўзорамі.

Сучасныя майстрыхі, якія вышываюць кашулі, аздабляюць іх дзвюма планкамі з вышыўкай, а пасярэдзіне ідзе разрэз, каб выраб было зручней надзяваць. Але раней мужчынскія кашулі маглі быць з рознымі манішкамі, якія адкідваліся, зашпільваліся як на правы, так і на левы бок (гэтак жа і з завязваннем паясоў — у традыцыі сустракаюцца розныя варыянты). Асаблівае стаўленне да мужчын і жанчын магло прасочвацца ў абрадах, у царкоўных традыцыях, а вось у матэрыяльнай культуры сімволікі не захавалася. На думку Аляксея Друпава, не варта арнаменты падзяляць на выключна жаночыя і мужчынскія, вельмі падобныя ўзоры маглі сустракацца і на кашулях, і на фартухах. Расшыфроўка элементаў (маўляў, некаторыя з іх азначаюць сям'ю, зямлю і гэтак далей) — гэта хутчэй справа кабінетная, сучасная. Носьбіты ж такіх тлумачэнняў не даюць, кажуць, што проста шыюць і вышываюць так, як рабілі іх продкі.

На ўсходзе Беларусі пад уздзеяннем суседзяў былі пашыраны так званыя касавароткі. Так, найбольш часта кашулі з касым каўняром сустракаліся на Віцебшчыне і Магілёўшчыне. У апошняй мужчынскі строй часам рабіўся з кроем на гестцы. Выкарыстанне такой квадратнай планкі — адно са сведчанняў таго, што майстрыхі гэта рабілі пад уплывам гарадской культуры.

ПАЯСЫ І ВАЛЁНКІ

Часам падказаць, з якога рэгіёна паходзіць той ці іншы строй, можа пояс. Найбольш архаічныя пляліся на сцяне. Іх фрагменты знаходзілі падчас археалагічных даследаванняў. На Палессі такія вырабы ўжываліся да сярэдзіны XX стагоддзя. Паясы, якія пляліся як каса, найбольш былі пашыраны на мяжы з Літвой і Латвіяй, тканыя на ніту ці бёрдзе з гарызантальнай паласой былі характэрнымі для заходняга Палесся.

У паясах і жаночых гарсэтах сакуноў (так за спецыфіку маўлення называлі жыхароў вёсак Асіповіцкага і Старадарожскага раёна) пераважаюць жоўты і чырвоны колеры. І справа тут зусім не ў густах вяскоўцаў. Проста сярод лясоў і балот, дзе яны жылі, з балотнай руды іх папярэднікі навучыліся здабываць такія колеры.

Часам нават тое, як заплецены ніткі на канцы пояса, можа сведчыць, у якім рэгіёне ён быў зроблены.

Найбольш заможныя сяляне маглі насіць скураныя паясы. Этнограф Чэслаў Пяткевіч, які апісваў сялянства канца XIX стагоддзя, пісаў, што мужык за раменьчык і жалезку задушыцца. У той час любы кавалак металу ці скуры лічыўся багаццем. Апошнюю імкнуліся пусціць на конскую збрую. Таму скураны пояс быў паказчыкам заможнасці чалавека. Гэтак жа як і скураныя пасталы. Такі абутак часцей насілі на паўночным захадзе, у больш развітых рэгіёнах. А бяднейшае насельніцтва абыходзілася звычайнымі лыкавымі лапцямі.

Валёнкі ж у нашых краях з'явіліся даволі позна. Людзі, якія іх выраблялі, маглі на некалькі месяцаў сысці з дому, каб падзарабіць. Жылі яны пераважна ў гаспадароў, якія замовілі валёнкі, і працавалі з аўчынай, якую ім выдзяляў гаспадар. На жаночую пару сыходзіла каля 600—700 грамаў воўны, мужчынскую — каля кілаграма. Давайце згадаем, што майстроў, якія валялі, называлі шапаваламі. А ўсё таму, што найперш яны валялі шапкі. Магерка (мадзьярка, венгерская шапка) атрымала распаўсюджанне з XVI стагоддзя дзякуючы Стэфану Баторыю. Кучмы, якія мелі цыліндрычную форму, у асноўным насілі на Палессі. У маразы не абысціся было без аблавухі. На шыю павязвалі ваўняную хустку, бо шалікаў у нашых вёсках у ранейшыя часы не было.

У сярэдзіне XIX стагоддзя пад уплывам гарадской моды з'яўляюцца картузы. Гэты галаўны ўбор ва Усходнюю Еўропу прыйшоў з Нідэрландаў у канцы XVIII стагоддзя, а пасля скарыў мужчын розных краін. Папулярнымі былі і саламяныя вырабы. У дадатак да распаўсюджаных капелюшоў з'явіліся саламяныя картузы.

КАМІЗЭЛЬКІ, СВІТКІ, КАЖУХІ

У канцы XIX стагоддзя ў вёсках, якія размяшчаліся бліжэй да гарадоў і мястэчак, пачынаюць з'яўляцца мужыкі ў камізэльках. Чалавек, які часта бываў у горадзе, мог падгледзець там такі элемент вопраткі, а пасля папрасіць жонку зрабіць яму нешта падобнае. А багацейшыя набывалі камізэльку ў мястэчку.

Калі казаць пра верхняе адзенне, перадусім трэба згадаць пра світку, якая была запатрабаванай у розныя сезоны. Самы просты варыянт — халатнага крою світка «з вусамі» (так у народзе празвалі трохкутныя кліны, якія ўстаўляліся па баках. У цэнтры і на ўсходзе Беларусі такое адзенне магло быць шэрым, бэжавым. На ўсходзе больш паважалі сукно белага колеру. Пад уплывам гарадской моды крой світкі пачынае мяняцца. З'яўляюцца «мадэлі» з адкіднымі каўнерыкамі. На Віцебшчыне вядомы такі варыянт верхняга адзення, як насоў. Калі світка была ваўняная, больш цёплая, то насоў — звычайна льняны. На паўночным захадзе Міншчыны, на Гарадзеншчыне і крыху на Віцебшчыне былі запатрабаваны бурносы. Адметная дэталь такой вопраткі — башлык, які звычайна прышпільваўся гузікамі ці прывязваўся вяроўкай. Пры жаданні яго можна было зняць.

Адной з самых каштоўных рэчаў лічыўся кажух. Згодна са статутам ВКЛ 1588 года, за яго крадзеж вінаваты павінен быў заплаціць капу грошай (60 грошаў). Для прыкладу: за крадзеж вала ці каня ішло 2 капы. Звычайна кажух быў карычневага колеру. Калі скуру дубілі, залівалі адвар дубовай кары альбо альховых шышачак, які ўплываў на колер будучай вопраткі. Адны з найлепшых майстроў, якія выраблялі дублёнкі, што ішлі нават за межы Беларусі, вядома, жылі ў Моталі. Часам можна пачуць, што менавіта ў Моталі вынайшлі дублёнку.

Выпраўляючыся ў далёкі шлях, паверх кажуха маглі накінуць сярмягу — каб засцерагчы яго ад забруджвання.

А ўжо каб уявіць цалкам, як выглядалі мужчыны сто гадоў таму, трэба згадаць пра аксесуары. Сярод іх маглі быць скураныя торбачкі, у якіх насілі трубку і крэсіва, кісеты для тытуню. Тканінная торбачка ці плеценая з бяросты сумка (якая, між іншым, добра захоўвае цяпло) былі зручнымі для таго, каб узяць з сабой ежу...

Сучасныя майстрыхі, якія займаюцца аднаўленнем нацыянальных строяў, часта выкарыстоўваюць тэхніку вышывання крыжыкам. Для нашай тэрыторыі больш характэрным у мінулым быў усё ж процяг — вышыўка, якая імітавала пераборнае ткацтва.

